Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).
ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.
Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к.; „ 3 „ — 2 р. 70 к.; „ 6 „ — 4 р. — к.; „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к., месцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі насярод тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15; за кожны дадатковы 5. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 117 (2305) Серада, 23-га мая 1928 г.

Саветы і будаўніцтва калектыўных гаспадарак на вёсцы.

Выходзячы з таго, што сацыялістычнае перабудаваньне сельскай гаспадаркі і сапраўдны ўздым эканамічнага і культурнага дабрабыту бядняцка-серадняцкіх мас сялянства магчымы толькі на падставе пераходу дробных і драбнейшых (індывідуальных) паасобных сялянскіх гаспадарак да буйнага аб'яднаньня гэтых гаспадарак, ХУ партзьезд паставіў задачу калектывізацыі, каапэраваньня сельскае гаспадаркі, як галоўную задачу нашай працы на вёсцы.

Немажлівасьць скарыстаньня ўсяго лішку насельніцтва вёскі прамысловасьцю, прысутнасьць у вёсцы значных колаў маламоцнага сялянства, якое ня мае магчымасьці індывідуальным парадкам палепшыць сваю гаспадарку, імкненьне беднаты вёскі гаспадарча ўмацавацца і вызваліць сябе ад эксплёатацыі кулака,—усё гэта стварае неабходнасьць з боку саветаў і выканаўчых камітэтаў самых уважлівых адносін да справы калектывізацыі сельскае гаспадаркі, рашучай, усямернай, штодзённай дапамогі калектывам у іх цяжкай будаўнічай працы. Вопытжа апошняга часу ў калхозным будаўніцтве паказаў, што ў гэтым будаўніцтве саветы не зьяўляюцца непасрэднымі ўдзельнікамі арганізацыі гаспадарчых калектываў; арганізацыя іх, як і раней, у большасьці ідзе стыхійна. Таму часта калектывы будуюцца не на здаровых арганізацыйна-гаспадарчых падставах, а часта з мэтай атрыманьня крэдыту на свае асабістыя паасобныя патрэбы; зразумела, што гэтыя калектывы няжыцьцёвы і хутка развальваюцца.

Значэньне калектыўных гаспадарак у справе сацыялістычнага перабудаваньня сельскае гаспадаркі, іх роля ў арганізацыі вясковае беднаты і, наогул, у палепшаньні дабрабыту вёскі дыктуюць неабходнасьць усямернага і сапраўднага падтрыманьня гэтага руху з боку дзяржавы ў асобе саветаў і выканкомаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту. Найперш з боку саветаў трэба павесьці рашучую барацьбу са спробамі паасобных кулацкіх элемэнтаў арганізоўваць і скарыстоўваць фальшыва-калектыўныя гаспадаркі ў сваіх асабістых мэтах. Дапамагаць арганізацыі калектываў з батракоў, беднаты і серадняцкага сялянства вёскі, сапраўды жадаючага перабудаваць гаспадарку на сацыялістычных падставах. Дабівацца льготных умоў куплі машын толькі тым машынным таварыствам, якія складаюцца з бядняцкіх і серадняцкіх жыхароў вёскі. Дапамагаць арганізуючым калектывы і таварыствы органам не дапушчаць у органы кіраўніцтва і ў лік устаноўшчыкаў асоб, якія пазбаўлены права абіраць у саветы.

Пастановы Саюзнага і Беларускага Ураду аб дармовай перадачы калектыўным гаспадаркам прамысловых і дапаможных прадпрыёмстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі калхозаў, павінны быць цалкам выкананы безадкладна. Калектывізацыі і каапэраваньню сельскае гаспадаркі наогул трэба дапамагаць па ўсіх галінах савецкае сыстэмы.

Мы ведаем, што важнейшае значэньне маюць гаспадарчыя будоўлі агульнага карыстаньня; яны цягнуць за сабой пашырэньне і паглыбленьне агульных (аграмаджаных) сродкаў вытворчасьці машын, жывёлы, запасаў і г. д. Калектыўныя будынкі паглыбляюць грамадзкі пачатак у быт, уздымаюць культурны ўзровень і замацоўваюць калектыўн. вядзеньне гаспадаркі. Савецкія органы на мясцох, у сэнсе дапамогі калектывам ствараць, будаваць калектыўныя жыльлёвыя будынкі маюць магчымасьць рабіць поўнае садзейнічаньне, шляхам забясьпечаньня лясными матар'яламі з сваіх фондаў.

Акрамя гэтага, трэба ставіць пытаньне аб водпуску доўгатэрміновага крэдыту, водпуску лесу на льготных умовах і г. д., на пабудову калектыўных як жыльлёвых, гэтак і гаспадарчых будынкаў. Машынізацыя калектыўных гаспадарак зьяўляецца важнейшай задачай будаўніцтва калектываў. Таму ўсе нізавыя савецкія органы павінны дапамагчы дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям станоўча вырашыць гэту задачу.

Саветы павінны дапамагчы ўліць у існуючыя калектывы сьвежыя сілы з батракоў, безьзямельнай і малазямельнай беднаты. Паасобныя існуючыя калектывы (частка яўрэйскіх), маючыя значныя плошчы зямлі пры невялікім ліку сяброў калектыву, робяць немагчымым уваход у калектыў новых сяброў калектыву надзвычайна павялічаным сяброўскім узносам. У гэтыя калектывы могуць залучацца асобы, якія карыстаюцца значнымі сумамі грошай; батраку і беднаце ў гэтыя калектывы з надзвычайна вялікімі сяброўскімі ўзносамі ўваход немагчымы. Такія зьявішчы гавораць аб тым, што ў тыповым статуту аб калектывах трэба зрабіць некаторыя зьмены, каб даць большую магчымасьць бяднейшым колам працоўнага насельніцтва ўдзельнічаць у будаўніцтве новых калектываў і здаровым папаўненьні існуючых.

Калектывы, якія ёсьць у БССР, у сваёй большасьці, асабліва калектывы яўрэйскіх земляробаў, жыцьцёвы, маюць значныя гаспадарчыя дасягненьні, пасьпяхова ўжываюць тэхніку: машыны, трактар, сартавыя засевы, разводзяць гатунковую жывёлу і г. д. Ёсьць і шмат недахопаў. Напрыклад, шмат калектываў яшчэ да гэтага часу не земляўпарадкавана, што зьяўляецца аднэй з галоўных прычын распаду незамацаваўшыхся калектываў. Выканкомы і саветы ў гэтай справе павінны праводзіць у земляўпарадкаваўчай працы першачарговасьць для калектываў.

Пасьпяховае разьвіцьцё калектывізацыі патрабуе ад нас самай сур'ёзнай увагі па лініі культурна-асьветнай працы. Школы, хаты-чытальні, ленінскія куткі, радыё павінны з дапамогай саветаў і выканкомаў прыблізіць непасрэдна сваю працу да існуючых і арганізуемых калектываў. Саветы павінны праз культарганізацыі дапамагчы калектывам стаць асяродкам савецкай агульнай і гаспадарчай культуры на вёсцы. Калектывы, з дапамогай саветаў, павінны даказаць на справе сваю пераважнасьць ва ўсіх галінах перад індывідуальнымі гаспадаркамі і гэтым самым рабіць уплыў на масу сялянскіх гаспадарак. Зразумела, што для гэтага калектывам, як і саўгасам, трэба мець самую шчыльную сувязь з мясцовым насельніцтвам, дапамагаючы бядняцка-серадняцкай масе і садзейнічаючы пераходу яе да калектыўных форм гаспадаркі, паднімаючы тэхніку сельска-гаспадарчай вытворчасьці, аказваючы ўплыў на грамадзкае жыцьцё вёскі паднясцем яе гаспадарчага і культурнага ўзроўню. Пры дапамозе з боку саветаў і райвыканкомаў калектывы павінны: паставіць на належную вышыню арганізацыю і вядзеньне сваёй гаспадаркі, дапамагаць бядняцка-серадняцкай масе, шляхам дачы для карыстаньня на пракат машын, рабочай жывёлы, рамонту гаспадарчых прыладаў, палепшаньня жывёлы, насеньня на самых даступных умовах.

Калектывы павінны быць цесна зьвязаны са ўсімі грамадзкімі арганізацыямі вёскі, асабліва з каапэрацыяй, камітэтамі сялянскай узаемадапамогі. Для таго, каб калектывы сапраўды зьявіліся месцамі разьвіцьця савецкае культуры на вёсцы, яны павінны ўзяць на сябе прыклады арганізацыі дзіцячых ясьляў, клюбаў, бібліятэк, розных курсаў, гурткоў і гэтак далей.

У справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкага сялянства па паглыбленьні сацыялістычных элемэнтаў на вёсцы і рашучага наступу на кулака на будаўніцтва гаспадарчых калектываў на вёсцы ўскладаюцца вялікія задачы, а таму саветы і выканкомы павінны ўсямерна дапамагаць пасьпяховаму вырашэньню гэтае агульнае задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

А. ХАЦКЕВІЧ.

Індусы абвяшчаюць байкот Англіі.

КАБУЛ, 18-5. Водлуг паведамленьняў індыйскае прэсы, у Індыі ізноў шырока праводзіцца байкот брытанскіх тавараў. У шмат якіх гарадох на масавых мітынгах арганізуюцца спэцыяльныя лігі для байкоту ангельскіх тавараў і ўсяе чужаземнае мануфактуры. Для вядзеньня прапаганды ў Бамбэі абраны спэцыяльны камітэт.

Канфэрэнцыя сваражыстаў Бэнгальскае правінцыі таксама ўхваліла па дакладу вядомага нацыяналісцкага лідэра Сэн-Гунта рэзалюцыю за байкот.

Пэрсель забалётыраваны.

Рабочыя масы ідуць за камуністамі.

МАСКВА. Водлуг атрыманых у Маскве вестак, у шмат-якіх прафэсыянальных саюзах Англіі адбываюцца выбары дэлегатаў на надыходзячы ў верасьні кангрэс трэд-юніёнаў. У саюз рабочых па вырабу мэблі пры выбарах дэлегатаў на кангрэс трэд-юніёнаў ПЭРСЕЛЬ ПАЦЯРПЕЎ ПАРАЖЭНЬНЕ. Замест яго быў абраны т. А. Томкінс, лёнданскі арганізатар саюзу і член кампартыі.

Перамога Томкінса ў сучасны момант мае вялізнае значэньне ўласна таму, што генэральная рада і ўся верхавіна прафсаюзаў вядзе шалёную кампанію проці выбараў на кангрэс членаў кампартыі і членаў руху меншасьці.

Нямецкі пралетарыят аддаў свае галасы кампартыі.

Лік меншавіцкіх галасоў павялічыўся за кошт дробнае буржуазеі.

Меншавікі ідуць на кааліцыю з буржуазнымі партыямі.

Разьмеркаваньне мандатаў у новым рэйхстазе.

БЭРЛІН, 21-5. Водлуг папярэдняга афіцыйнага падліку вынікаў выбараў у рэйхстаг, усяго пададзена 39 міліёнаў 592 тысячы галасоў.

Галасы разьмяркоўваюцца гэтак (у дужках падаюцца вынікі выбараў у сьнежні 1924 г.)— камуністы атрымалі 3.233 тысячы галасоў (2.679 тысяч), яны атрымалі мандатаў 54, было—45; сацыял-дэмакраты атрымалі 9.111 тысяч галасоў (7.788 тысяч) мандатаў 152, было—131; дэмакраты атрымалі 1.493 тысячы галасоў (1.902 тысячы), мандатаў 25, было—32; партыя цэнтру атрымала 3.705 тысяч галасоў, мандатаў 62; народная партыя атрымала 2.670 тысяч галасоў, мандатаў 44; баварская народная партыя атрымала 936 тысяч галасоў, мандатаў 16; гаспадарчая партыя атрымала 1.391 тысяча галасоў, мандатаў 23; нацыяналісты атрымалі 4.360 тысяч галасоў, манеатаў 76; нацыянал-сацыялісты (фашысты) атрымалі 807 тысяч галасоў, мандатаў 12.

Іншыя групы атрымалі параўнаўча невялікую колькасьць галасоў. Ультра-левыя камуністы сабралі 80 тысяч галасоў, мандатаў ня маюць.

У выбарах удзельнічала 71 проц. жыхарства.

БЭРЛІН, 21-5. Не зважаючы на вялікі лік выбаршчыкаў, новы рэйхстаг будзе мець меншы лік дэпутатаў, чымся чакалася. Замест 493-х дэпутатаў у старым рэйхстазе, новы рэйхстаг будзе складацца з 489-ці дэпутатаў. Усяго ў выбарах удзельнічала прыблізна 71 проц. выбаршчыкаў, проці 78,7 у сьнежні 1924 году.

Кампартыя ў Бэрліне наперадзе.

БЭРЛІН, 21-5. У палітычных колах надаюць вялікае значэньне вынікам выбараў у рэйхстаг у Бэрліне, зазначаючы, што тут камуністы мелі сваю найбольшую перамогу. Амаль-што ва ўсіх кварталах Бэрліну камуністы атрымалі больш галасоў, чымся сацыял-дэмакраты. Па ліку пададзеных у Бэрліне галасоў камуністы амаль-што параўналіся з сацыял-дэмакратамі і атрымалі больш усіх буржуазных партый разам. Рост камуністычных галасоў у Бэрліне значна перавышае бэрлінскі выйгрыш сацыял-дэмакратаў.

Для характарыстыкі перамогі камуністаў у Бэрліне трэба яшчэ адзначыць, што пры прэзыдэнцкіх выбарах у красавіку 1925 году камуністы атрымалі ў Бэрліне 280 тысяч галасоў, а зараз яны маюць 670 тысяч галасоў. У рэйхстаг абрана цяпер ад Бэрліну 11 камуністаў (было 7), а ў прускі ляндтаг—16 (было 9).

Меншавікі выводзяць буржуазею з тупіку.

БЭРЛІН. 21-У. Сярод шэрагу нечаканасьцяў у выніку нямецкіх выбараў асаблівае ўражаньне на палітычныя колы зрабіла страта галасоў партыі цэнтру, пазіцыя якое лічылася вельмі моцнаю.

Нацыяналісцкая „Лёкаль Анцэйгер“ заяўляе, што «посьпех сацыял-дэмакратаў, а асабліва камуністаў, нагэтульки значны, што нават людзям з нэрвамі больш моцнымі, чымся буржуазныя дэмакраты, зробіцца жудасна».

«Форвэртс» напамінае нядаўнюю прамову сацыял-дэмакратычнага лідэра Вэльса пры абмеркаваньні бюджэту ў рэйхстазе, у якой ён адкрыта заяўляе буржуазным партыям аб гатоўнасьці сацыял-дэмакратаў згадзіцца на кааліцыю.

Горкае расчараваньне ў лягеры буржуазеі.

БЭРЛІН, 21-У. Буржуазны друк усіх напрамкаў абгаварвае вынікі выбараў з няўтойваемаю незадаволенасьцю. Посьпехі камуністаў і страты буржуазных партый псуюць настрой нават прыхільнікам вялікае кааліцыі, якія ў выніку новых выбараў маюць магчымасьць яе ажыцьцёвіць. Органы нацыяналістаў засмучаны нябывалым паражэньнем сваёй партыі і спрабуюць згладзіць яго заўвагамі на шматлікасьць дробных партый, слабы ўдзел выбаршчыкаў на выбарах і іншыя моманты.

«Тэгліхэ Рундшаў» заяўляе аб бясспрэчнасьці надыходзячага заснаваньня ўраду вялікае каалацыі і зазначае, што посьпех сацыял-дэмакратаў можна прызнаць толькі на палову, паколькі адначасна значны посьпех мелі камуністы. «Больш як 3 з чвэрцю міліёнаў нямецкіх рабочых—піша газэта—пашлі на выбары пад лёзунгам—«баранеце Савецкі Саюз», г. зн., баронячы чужыя інтарэсы і выступаючы за зьнішчэньне ўласнае дзяржавы. Якая сумная, якая пагражаючая адзнака часу».

Ацэнка нямецкіх выбараў у Францыі.

ПАРЫЖ, 21-5. Увесь францускі друк са здаволеньнем адзначае вынікі выбараў у Нямеччыне.

«Тан» у перадавіцы піша: «Хоць канчатковыя вынікі выбараў у Нямеччыне яшчэ невядомы, аднак, папярэднія даныя сьведчаць пра бясспрэчны зрух нямецкіх выбаршчыкаў улева. Перамога нямецкае сацыял-дэмакратычнае партыі і паражэньне нацыяналістаў—бясспрэчная. Пра склад новага ўраду Нямеччыны гаварыць яшчэ рана. Аднак, можна напэўна лічыць адраджэньне правага блёку Нямеччыны немагчымым. Удзел нямецкіх сацыял-дэмакратаў ва ўрадзе, на наш погляд, няўхільны».

Газэта лічыць, што новы ўрад Нямеччыны будзе складзен на аснове шырокае кааліцыі ад сацыял-дэмакратаў да народнае партыі ўключна.

Выбары ў прускі ляндтаг.

Буйны посьпех кампартыі.

БЭРЛІН, 21-5. У прускі ляндтаг, у які выбары адбываюцца аднпчасна з рэйхстагам, абрана 450 дэпутатаў.

Па партыях мандаты разьмяркоўваюцца наступным чынам: **камуністы атрымалі 56 мандатаў, проці ранейшых 44-х, сацыял-дэмакраты 136 проці ранейшых 114, нацыяналісты--82 проці ранейшых 102, цэнтр--72 і г. д.** *Зрух улева на выбарах у прускі ляндтаг яшчэ больш моцны, чымся на выбарах у рэйхстаг.*

Галадоўка арыштаваных камуністаў у Сяміградзьдзі.

Нячуваная нагласьць турэмшчыкаў.

ВЕНА, 21-У. 3 арыштаваных у Сяміградзьдзі камуністаў, 30 усё яшчэ знаходзяцца ў вайсковым астрозе ў Кляўзэнбэрзе. Водлуг паведамленьня газэты „Кёлеці Уйшак“, 17 зьняволеных тры тыдні таму абвясьцілі галадоўку ў знак пратэсту проці незаконнага зьняволеньня іх у астрозе. З іх 6 цяжка хворыя і пераведзены ў вайсковы шпіталь, дзе яны ня спыняюць галадоўку.

Старшыня вайсковага суду ў Кляўзэнбэрзе штабс-капітан Тарпу ў гутарцы з супрацоўнікам „Кёлеці Уйшак“ заявіў дослоўна: „Пакуль судовая справа ня будзе скончана і вінаватыя ня будуць прысуджаны да адпаведнае кары, усякая галадоўка дарэмна, бо суд не скасуе загаду аб арышце, нават калі ўсе зьняволеныя памруць“.

Агенты Хорці хочуць выкрасьці Бэла Куна.

ВЕНА, 18-У. „Ротэ Фанэ“ паведамляе, што ў Вене знаходзіцца блізка 20-ці вэнгерскіх шпіёнаў, якія прыехалі, каб выкрасьці Куна. Кампанія пратэсту проці выдачы Бэла Куна, на чале з камуністычнай партыяй, ня спыняецца.

Суровы рэжым для Бэла Куна.

ВЕНА, 21-5. Газэта «Нэйес Вінэр Журналь» агалашае гутарку з намесьнікам старшыні венскага акруговага суду Айхінгэрам. Айхінгер пацьвердзіў, што ўмовы трыманьня Бэла Куна і таварышоў у астрозе пагоршаны, і зазначыў, што «практыка бэрлінскіх судовых устаноў, якую яны набылі пасьля ўцёку Отто Браўна, зусім апраўдвае гэтыя выключныя меры».

Водлуг паведамленьня сацыял-дэмакратычнае газэты „Арбайтэр Цэйтунг“, Бэла Кун прададзен вэнгерскім эмігрантам Алесем Клейнам, асуджаным раней венскім судом за ашуканства. Клейн пасьля арышту Бэла Куна не адзін раз бываў у вэнгерскім пасольстве ў Вене, дзе меў зносіны з начальнікам будапэшцкае палітычнае паліцыі Швэйніцэрам.

Літва.

Сумная ўрачыстасьць.

«Кур'ер Віленскі» (№ 111) паведамляе, што ўрачыстасьць з прычыны 10-годзьдзя літоўскай незалежнасьці прайшлі зусім няўдала. Ня было пачуцьця сьвята ня толькі ў народзе, але і сярод фашыстаў.

«Літоўскі народ мучыцца—як кажа «К. В.»—пад драконскім урадам фашыстаў, а фашысты жывуць у страху перад рэвалюцыяй».

Звольнена з астрогаў 122 вязьні.

У сувязі з агалашэньнем у Літве амністыі звольнена з астрогаў 122 вязьня. Яны зьяўляюцца пераважна крымінальнымі; асуджаных за палітычныя справы сярод іх амаль зусім няма.

„Товарищ“ пакінуў Англію.

ЛЁНДАН, 21-5. Савецкі парусьнік „Товарищ“, пацярпеўшы аварыю 25 лютага пры стычцы з італьянскім параходам, вышаў у Гамбург на буксіры параходу.

Праца польска-літоўскае эканамічнае камісіі.

ВАРШАВА, 21-5. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ўчора адбылося першае пасяджэньне польска-літоўскае камісіі па эканамічных пытаньнях, а таксама па пытаньнях зносін і транзіту.

Спатканьне Вальдэмараса з Чэмбэрленам.

ЛЁНДАН, 21-5. Агенцтва Райтэра паведамляе: «Літоўскі прэм'ер Вальдэмарас сёньня меў гутарку з Чэмбэрленам. Паведамляюць, што ў гутарцы закраналіся пытаньні, якія маюць агульнае значэньне і разгледжаны з пункту погляду далейшага пашырэньня традыцыйнае прыязьні, існуючае між гэтымі краямі».

У Рыме пачынаецца працэс 32-х камуністаў.

МАСКВА, 21-У. 28-га мая у спэцыяльным фашысцкім трыбунале ў Рыме распачнецца вялікі працэс правадыроў італьянскае кампартыі і арганізатараў італьянскае ўсеагульнае канфэдэрацыі працы. Перад судом будзе 32 таварышы.

Прысуд па справе Грамады.

209 гадоў катаргі.

(Па тэлефону ад уласнага карэспандэнта).

3 56-ці падсудных суд прызнаў 37 вінаватымі „ва ўдзеле ў змове, якая мела на мэце адарваць усходнія землі ад Польшчы“.

3 ліку абвінавачаных ранейшыя дэпутаты Грамады ТАРАШКЕВІЧ, РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, ВАЛОШЫН і МЯТЛА прысуджаны НА 12 ГАДОЎ КАТАРГІ КОЖНЫ. Сэкратар Грамады Бурсэвіч і юрысконсульт Акінчыц засуджаны на 8 гадоў катаргі кожны; 8 абвінавачаных—на 6 гадоў катаргі кожны, 9 абвінавачаных—на 5 гадоў кожны, 10 абвінавачаных на 4 гады кожны, 4 абвінавачаных—на 3 гады кожны.

19 абвінавачаных, у тым ліку Луцкевіч, Астроўскі і Коўш, прызнаны невінаватымі.

Пасьля абвяшчэньня пастановы суду, нехта з прысутных у залі кінуў абвінавачаным кветкі. Абвінавачаныя пачалі сьпяваць беларускі рэвалюцыйны гімн «Адвеку мы спалі».

Паліцыя зараз-жа вывела з судовае залі публіку.

УЛАДЗІМЕР САСЮРА.

АДПЛАТА.

Мы ў сьпеку і ў мароз увесь час на вас рабілі
—Складалі вам палац з крыві, з касьцей сваіх.
Са зьдзекам жылы з нас цягнулі—і душылі
Вы, паралітыкі, нявольнікаў нямых.

——

І срэбра, золата глыбока пад зямлёю,
У сырой, халоднай ймгле, капалі мы для вас,
А што далі вы нам з «культурнасьцю сваёю»,
—Таго ня зычу я і ворагу ў злы час.

——

Красуньням вашым мы брыльянты здабывалі,
А сёстры нашы ім зрабілі пекны ўбор,
А потым па начах у вокны зазіралі:
Пад гукі вальсу там кружыўся німфаў хор.

——

Вы—кветкі! Заўжды вас кахалі і цанілі;
Прывыклі ад жыцьця вы ўсё бяз бою браць,
За нашы грошы вас панамі быць вучылі
І залаты ланцуг душы сваёй каваць.

——

А мы... Вучыліся мы лаяцца у рудніках
І, плату ўзяўшы, сум гарэлкай заліваць,
Шукалі долі мы ў блуканьнях цяжкіх, нудных,
А сёстры нашыя—йшлі цела прадаваць.

——

Мы цалавалі крыж,—нам нож давалі ў рукі,
—І за аб'едкі з панскага стала
На брата брат ішоў і чуў малітваў гукі,
І за марамі кроў у баі сьляпым цякла.

——

А неба спала; ўсе цярпелі і маўчалі;
У бяздоньне падалі, як волава, вякі;
Сваіх прарокаў мы ў шаленстве крыжавалі,
А крывасмокам злым сплятали мы вянкі.

——

Урэшце дзень зазьзяў. Луска з вачоў адпала
—І мы убачылі, дзе вораг, а дзе брат,
—І помсты полымя у сэрцы запылала
На урачыстасьці Чырвоных Сьвят.

——

Лякаі цемры й зла! Ужо званы камуны
Апошнім рэквіем для вас гудуць, гудуць;
Карона, трон, палац—нізрынуцца у труны:
У праклёнах барацьбы званы трывожна б'юць.

——

І неба ўсё гарыць агнём сусьветнай кары;
Дзе пройдзем мы,—адзін там попел шалясьціць;
Вось на тыранаў злых пасыпаліся ўдары,
—І мозак на сьцяне, як той кісель, дрыжыць.

——

Ідзём вам адплаціць за сьлёзы, кроў і мукі,
За ўсё, што бедны люд, зьняволены, цярпеў,
—За гэта душым вас, ламаем ногі, рукі:
Крывёю вашаю насыціць хочам гнеў.

——

А ў полі... Сонца... май... Гудуць званы камуны,
У палёх і гарадох апошні бой кіпіць...
Кароны, трон, палац нізрынуцца у труны...
Дрыжэце—гэта мы ідзём вам адплаціць!

З украінскае мовы пераклаў
Л. ЦЬВЯТКОЎ.

У панскай Польшчы

Новы замах Пілсудчыны на мандаты камуністаў.

Бачынскі і Бітнэр пад пагрозаю выдачы суду.

ВАРШАВА, 21-У. Пасьля выдачы Сахацкага настае чарга іншым камуністычным дэпутатам. На павестцы пленуму сойму ў аўторак стаіць пытаньне аб выдачы суду камуністычнага дэпутата Бачынскага і пытаньне аб пазбаўленьні мандата камуністычнага дэпутата Бітнэра.

Пасла Сахацкага ловяць...

«Газэта Поранна» (№ 84) паведамляе, што паліцыя шукае выданага соймам камуністычнага пасла Ю. Сахацкага. Паліцыя думае, што ён знаходзіцца яшчэ ў Польшчы і ня здолеў, як здавалася раней, уцячы. За паслом Сахацкім разасланы экстраныя паведамленьні.

Стачачная хваля.

Забастоўкі на фабрыках.

18 мая г. г. на фабрыках „Унітас“ і «Фортуна» ў Вільні забаставалі рабочыя, жадаючы 30-процантнай падвышкі заработнай платы.

Забастоўка яўрэйскіх настаўнікаў.

Гэтымі днямі настаўнікі і інструктары яўрэйскай інстытуцыі і арганізацыі «Орт» абвясьцілі забастоўку на эканамічным грунце. Забастоўкай кіруе саюз яўрэйскіх настаўнікаў у Вільні.

Забастоўка дрэваапрацовачнікаў.

І Зардзях Валожын. пав. ў дрэваапрацовачных майстэрнях гданскага сэнатара Евэлеўскага забаставала 1000 работнікаў з прычыны нявыплаты ім каля 100 тысяч злотых.

У знак салідарнасьці.

Гэтымі днямі забаставалі работнікі фірмы Гумоўскага і Ясіновіча ў Вільні. Забастоўка абвешчана ў знак сваёй салідарнасьці з забастоўкай у Нова-Вілейску.

Справа Біспінга ў Горадні.

20 мая г. г. пачаўся ў Горадні сэнсацыйны працэс вядомага Біспінга, апраўданага нядаўна ў справе забойства Друцкага-Любецкага.

Біспінг абвінавачваецца ў забойстве беларускіх сялян і падпале вёскі. Справа гэта разыгралася яшчэ ў першыя дні незалежнасьці Польшчы, калі Біспінг прыдушаў у ваколіцах Горадні сялянскія паўстаньні. Аб гэтых падзеях Біспінга беларускія паслы сойму падалі ў свайм часе дакладную інтэрпэляцыю ў сойм.

Белагвардзейцы - тэрарысты вызваляюцца з-пад варты.

ВАРШАВА, 21-У. На распарадчым пасяджэньні суд адхіліў хадайніцтва арыштаваных у зьвязку з замахам на т. Лізарава расейскіх эмігрантаў вызваліць іх да разгляду справы. У адносінах 4-х арыштаваных суд ухваліў пастанову пакінуць іх у астрозе да разгляду справы. У адносінах іншых арыштаваных пастаноўлена вызваліць іх пад высокі заклад у 10 тысяч злотых за кожнага.

Камуністычны сьцяг у Сьвянцянах.

«Кур'ер Віленскі» падае, што ў Стар. Сьвянцянах невядомыя асобы вывесілі камуністычны сьцяг на коміне дому, дзе пражывае старшыня прафэсыянальнага саюзу работнікаў ад'еджавага промыслу. Сьцяг зьняла паліцыя.

Партрэт «ідэёвага» белагвардзейца.

ВАРШАВА, 21-5. Як паведамляе друк, сьледзтва выявіла, што рабіўшы замах на Лізарава, Вайцахоўскі ня раз быў замешаны ў растраце сум таварыства расейскіх эмігрантаў. Растраты гэтыя, аднак, звычайна прыкрываліся.

Замах на парахоўню?

Уначы з 17 на 18 мая ў Вільні ўчынен быў невядомымі асобамі замах на парахоўню. У часе, калі вартаўнік стаяў каля парахоўні, да яе падышло некалькі асоб, якія абсыпалі яго градам куль і паранілі ў нагу. Злачынцы зьбеглі.

Судовая расправа.

Адміністрацыя прыцягнула да судовае адказнасьці газэту «Голас Працы» за надрукаваньне ў № 10 артыкулу, якога газэта «Дзеньнік Віл.» не называе.

ППС-лявіца і камуністы.

«Дзеньнік Віл.» (№ 112) паведамляе, быццам між ППС-лявіцай і камуністамі адбылася нарада, на якой пастаноўлена падняць энэргічную акцыю сярод беспрацоўных, маларольных і батракоў і пачаць выдаваць часопісі: «Сялянскія ведамасьці» і „Сялянская вольнасьць“.

Працэс шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў.

Яшчэ адзін абаронца дзейнічаў прыгнятаючы на падсудных. Пракуратуры даручана расьследаваць гэтую справу.

Пачаўся допыт абвінавачаных.

Хадайніцтва аб абароне абвінавачанага Майера.

МАСКВА, 21-5. Ранішняе пасяджэньне суду па справе эканамічнае контр-рэвалюцыі на Данбасе 21 мая распачалося з агалашэньня тав. Вышынскім, пададзенага на імя Вярхоўнага суду СССР тэлеграфнага хадайніцтва праўленьня саюзу мэталёўцаў у Бэрліне з просьбаю дапусьціць для абароны падсуднага Майера адваката Мундэ, які прысутнічае ў судзе ў якасьці кансультанта нямецкае фірмы «АЭГ». Абаронца Майера адвакат Вормс просіць гэтае хадайніцтва задаволіць.

Суд прызнаў хадайніцтва гэтае лічыць ня маючым важнага значэньня, бо абаронца Вормс незалежна ад удзелу адваката Мундэ мае поўную магчымасьць ажыцьцёвіць кансультацыю праз прыцягненьне сьвядомых асоб.

Заява падсудных Сушчэўскага і Казарынава.

Потым Вышынскі агалашае заяву падсуднага Сушчэўскага, у якой Сушчэўскі выказвае няўпэўненасьць, што ён будзе ў патрэбнай меры задаволен абаронаю, бо яго абаронца Дэйніке пры першым спатканьні на запытаньне Сушчэўскага, што яму пагражае, адказаў: «Ня буду вас супакойваць: прызнаньне вашае віны заслугоўвае растрэлу. Выратаваць вас можа тое, што вас шмат—50 чалавек не растраляюць, не растраляюць нават і 20-ці, растраляюць, зразумела, кіраўнікоў, і вы можаце ня трапіць у гэты лік».

Другі падсудны Дэйніке Казарынаў у сваёй заяве просіць перадаць яго абарону другой асобе, бо Дэйніке зазначаў яму, што «грунтуючыся на зробленым прызнаньні, падсудны будзе растраляны».

Спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага суду пастанавіла: хадайніцтва Казарынава задаволіць і Дэйніке ад яго абароны вызваліць. Адначасна вызваліць Дэйніке і ад абароны Сушчэўскага. Разам з тым паколькі заявы Казарынава і Сушчэўскага супадаюць з ужо раней разгледжанымі заявамі Матава і Братаноўскага ў адносінах абаронцы Мураўёва і што, маркуючы па заяве Казарынава, між абаронцамі існаваў згавор, даручыць пракаратуры правесьці расьследаваньне па гэтай справе.

Часова абарона просіць назначыць Левэнбэрга адвакатам Сушчэўскага і Казарынава.

Суд хадайніцтва абароны здавальняе.

Потым суд распачынае допыт абвінавачваемых.

Некаторыя факты шкодніцтва.

Паказаньні абвінавачанага Беразоўскага.

Першым дае паказаньні падсудны Беразоўскі.

«Грамадзяне судзьдзі,—пачынае Беразоўскі свае паказаньні,—я ўжо паказаў, што я ў сваіх злачынствах вінаваты. Я выкарыстаю гэты момант, —гаворыць ён,—каб растлумачыць суду, як праходзіла шкодніцтва, залежаўшае ад мяне непасрэдна, і таксама, каб расказаць аб тых фактах шкодніцтва, якія залежалі ад мяне толькі часткова. Разказаць аб усім, што ведаю, што я лічу важным ня толькі для суда, каб ён разабраўся ў гэтай справе, але яшчэ і таму, каб зьняць з сябе ўвесь той цяжар, які столькі часу ляжаў на мне.

Свае паказаньні Беразоўскі пачынае з таго, што апавядае свой жыцьцёпіс.

Капіталістычны лад, ва ўмовах якога працавала наша прамысловасьць, —гаворыць Беразоўскі,—казаўся мне непарушным, я лічыў, што гэта так і павінна быць. Надышлі гады імпэрыялістычнае вайны, потым вайны грамадзянскае, Беразоўскі працаваў тады на капальнях. Пытаньне, што будзе з каменнавугольнай прамысловасьцю, ужо тады абмяркоўвалася гаспадарамі, але тыя інжынэры, якія працавалі ў капальнях яшчэ ня ведалі аб тым, што можа адбыцца ў бліжэйшы час. У той пэрыяд гутаркі былі аб тым, што калі часова і прыдзецца адмовіцца ад прадпрыемстваў, дык іх трэба будзе захоўваць у цэласьці, захоўваць іх так, каб, як яны вернуцца да «сапраўдных уласьнікаў», ня страцілі ранейшае каштоўнасьці. Дырэктыў ніякіх у той час ня было, але ўжо гэтыя гутаркі малявалі шлях, па якім павінен быў пайсьці інжэнэр, які застаўся на капальнях.

У 1920 г. пачалася праца Беразоўскага ў Аляксандрава-Грушаўскім раёне, які знаходзіўся недалёка ад Растову. У гэты пэрыяд Беразоўскі сустракаецца з шэрагам спэцыялістаў-інжэнэраў і тэхнікаў, якіх ён ведаў раней, і яны яго ведалі. Адзін з іх фігуруе на працэсе. Гатаркі пачаліся «бяз усякага ўтойваньня». Кожны з спэцыялістаў, асабліва дробныя ўласьнікі капальняў, якія засталіся тут, лічылі сябе, водлуг слоў Беразоўскага, толькі часова адсунутымі ад сваёй звычайнай працы, ад сваёй уласнасьці.

Я ў той час думаў—гаворыць Беразоўскі,—што ўласнасьць ёсьць жыцьцёвы закон. Я думаў, што ўласнасьць ня можа быць адабрана, што сацыялістычная структура, калі ня будзе ўласнасьці, выкліча адсутнасьць зацікаўленасьці да ўсяго, што на гэтай глебе не пабудуецца нічога моцнага, што ўсё зруйнуецца.

Пераходзячы да актаў сваёй шкодніцкай працы ў яе першы ізаляваны пэрыяд, Беразоўскі спыняецца на Бессяргееўскай праходцы, якая была распачата пры старых уласьніках, была праведзена на 50 саж. і да гэтае пары застаецца няскончанаю. Беразоўскі раней лічыў гэтую капальню карыснаю, лічыў, што яна можа быць скончана, што яе можна з выгодаю эксплёатаваць. Справа ў тым, што на гэтую капальню ў свой час зьвярнулі ўвагу прамыслоўцы. Яна была натуральным працягам Петрапаўлаўскае капальні і агульнасьць праўленьня на месцы, агульнасьць канторы, майстэрняў і г. д. Усё гэта і прымусіла ў свой час закласьці Бессяргееўку. Беразоўскі ўтойваў ад савецкае ўлады гэтую выгадную капальню.

Капальню „Азоўская кампанія“ параўнаўча невялікую, але кампактную, Беразоўскі, як прызнаецца, прыпыніў, скарыстаўшы загад вышэйшых органаў сканцэнтраваць працу на асобных капальнях і не раскідацца.

У канцы 1924 г. Беразоўскі знаёміцца з інжэнерам Шадлуном. Тут і адбываецца тая гутарка Беразоўскага з Шадлуном, якая даволі падрабязна падаецца ў акце абвінавачаньня. Шадлун перадае, што гаспадары не забываюць яго, падтрымліваць. Беразоўскі зайздросьціць яму. Калі нічога ня было, калі ў кішэні быў толькі адзін паёк, зразумела, было чаму зайздросьціць. Шадлун ахвотна дапамог Беразоўскаму ў яго бядзе. Пры ўмове дапамогі інтарэсам гаспадароў за захоўваньне нетраў і слабы здобыч, утойваньне выгодных капальняў і спыненьне іх Беразоўскі можа атрымаць грашовую дапамогу ад гаспадароў.

Беразоўскі згаджаецца. Ён ужо нешта зрабіў. Бессяргееўскую капальню і Азоўскую прыпыніў. Далейшыя дырэктывы Беразоўскі атрымлівае ў пісьмовым выглядзе ад Гарлецкага (таксама абвінавачваемы), а потым атрымлівае і грошы. Такім чынам, Беразоўскі робіцца ўдзельнікам шкодніцкае арганізацыі.

Ад Беразоўскага ніці ідуць да Калганава. Для згоды з апошнім ня трэба было шмат часу. Таксама і з Някрасавым (таксама адзін з падсудных). Потым Беразоўскі уцягнуў у арганізацыю і інжэнера Кузьму.

У далейшым Беразоўскі паказвае, што ў пачатку 1925 г. пачаўся другі пэрыяд шкодніцтва—пагоршаньне якасьці і павялічэньне сабекошту, зьнішчэньне падкоўнага і фрыкетнага заводаў.

Далей Беразоўскі характарызуе свае шкодніцкія ўчынкі ў адносінах да электрасілавое гаспадаркі, дробных капальняў, сартыроўкі і здобычу вугалю.

Пасьля паказаньняў Беразоўскага, пачынаецца яго допыт.

На запытаньне, колькі ён атрымаў грошай з-за граніцы, Беразоўскі адказвае: „Каля 150 тысяч руб.; з гэтых грошай, водлуг слоў Беразоўскага, ён пакінуў сабе 15-20 тысяч, рэшту разьмеркаваў па капальнях.

Далей, адказваючы на запытаньне, які характар мелі весткі, якія зьбіраліся і перадаваліся заграніцу ў пэрыяд 1925 да I—1926 г. Беразоўскі адказвае: агульная характарыстыка працы і статыстычныя матар'ялы.

На вячэрнім пасяджэньні ня спыняўся допыт Беразоўскага. На запытаньне т. Крыленка, калі павінен быў пачацца асабліва значны вынік зьніжэньня здобычу вугалю, Беразоўскі адказаў: „Я думаю, што гэта здарылася-б у 1931-32 годзе. У гэты час распачаўся-б няўхільны крызіс з дастаўкаю апалу для ўсяго краю“.

Пасьля запытаньняў абвінавачаньня Беразоўскі адказаў на шэраг запытаньняў абароны.

На гэтым вячэрняе пасяджэньне 21-га мая скончылася.

Тав. Чычэрын аб палітыцы дзяржаў у Кітаі.

Гутарка з прадстаўнікамі савецкае прэсы.

МАСКВА, 21-У. Чычэрын у гутарцы з супрацоўнікамі савецкага друку даў наступныя адказы, на зробленыя яму запытаньні аб палітыцы Японіі ў Кітаі:

Першае запытаньне: Як адносіцца НК Замежных Спраў да падзей у Цзынані і наогул да мэмарандуму Японіі наконт паўночнага Кітаю?

Адказ: Бязумоўна, адмоўна. Хто сочыць за палітыкаю савецкага ўраду за 10 гадоў яго існаваньня, таму няцяжка зразумець, што ён ня можа згадзіцца ні проста, ні ўкосна, як з інтэрвэнцыяй, так і з вайсковай акупацыяй наогул, а ў адносінах да кітайскага народу—у прыватнасьці. Палітыка савецкага ўраду—палітыка добрасуседзкіх адносін з Кітаем і бязумоўнага няўмешваньня ва ўнутраныя справы Кітаю.

Другое запытаньне: Як адносяцца іншыя дзяржавы да мэмарандуму Японіі.

Адказ: У мяне няма вычэрпваючых вестак аб усіх дзяржавах, якія маюць дачыненьне да Кітаю. Але, водлуг даных, якія я маю, такія дзяржавы як Англія, Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты і Францыя адносяцца з ухвалою да ўсіх крокаў, ужытых Японіяй у Кітаі.

Трэцяе запытаньне: Як сумясьціць усё гэта з «мірнаю рольлю Лігі Нацый, з праэктамі разброеньня і «вечнага міру» і з канвэнцыяй аб забароне ўвозу зброі ў Кітай?

Адказ: Лёгічна гэтага вядома сумясьціць нельга. Але словы аб міры ў Лізе Нацый—гэта адно, а факты ваеннае інтэрвэнцыі—гэта зусім другое. Факты мацней за словы. Таму гутаркі буржуазных дзеячоў аб міры ня будуць сустракаць давер'я.

Чацьвёртае запытаньне: Ці выходзіць, што Ліга Нацый у гэтай справе ўмые рукі, маўкліва згаджаючыся з падзеямі ў Кітаі?

Адказ: Але, так выходзіць.

Пятае запытаньне: Ці праўда, што японскае войска, расквартаравалася ў «вайсковым гарадку» СССР у Пекіне?

Адказ: Не, ня зусім праўда. У пачатку былі весткі, што частка японскага войска расквартэравалася ў «вайсковым гарадку» СССР у Пекіне, не зважаючы на пратэст нашага консула ў Пекіне. Але потым былі атрыманы больш поўныя весткі, з якіх відаць, што японскія салдаты, якія спрабавалі заняць „вайсковы гарадок», прымушаны былі адступіць. «Вайсковы гарадок» зьяўляецца ўласнасьцю СССР і ніякае войска ня мае права яго займаць.

Тыдзень абароны—з 15-га чэрвеня.

Цэнтральны Савет Асо-Авіяхіму СССР пастанавіў правесьці „Тыдзень абароны“ з 15-га па 22-га чэрвеня.

«Тыдзень абароны» пройдзе пад лёзунгам уцягненьня новых кадраў рабочых і сялян у практычную работу па будаўніцтву абароны і палепшаньні якасьці работы ў нізавых органах Асо-Авіяхіму.

У працягу «Тыдня абароны» будуць праводзіцца конкурсы і спаборніцтвы на лепшую ячэйку Асо-Авіяхіму і гурток вайсковых ведаў. У гэты-ж час адбудуцца выпускі скончыўшых вайсковыя гурткі.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Новая цагельня.

БАРЫСАЎ, 21-У. На адлегласьці 13 кілёмэтраў ад г. Барысава ў вёсцы Студзёнкі адчыніўся вялікі цагельны завод.

На гэтым заводзе будзе занята звыш 200 рабочых.

Для рабочых пабудаваны баракі. Саюз будаўнікоў у хуткім часе ў клюбе заводу ўстанаўлівае гучнагаварыцель, коштам у 250 руб.

Уся пабудова заводу каштавала каля 360.000 руб.

52 тыс. руб. на с.-г. машыны.

Бабруйск, 22-V. *З кастрычніка месяца 1927 году па май месяц 1928 году сялянства Бабруйшчыны атрымала 52408 рублёў крэдыту на здабыцьцё сельскагаспадарчых машын і прыладаў. Большую палову гэтых сродкаў атрымала вясковая бедната.*

КРЭДЫТЫ НА НАСЕННАВОДЗТВА.

БАБРУЙСК, 22-V. Акруговым сельскагаспадарчым банкам за час веснавой пасеўнай кампаніі праз крэдытныя таварыствы выдана 2609 рублёў крэдытаў на разьвіцьцё насеннаводзтва. 1017 рублёў з гэтай сумы атрымалі беднякі, а астатнюю суму—сераднякі і арганізацыі.

2½ ТЫСЯЧЫ РУБ. НА КУЛЬТУРНЫЯ ПАТРЭБЫ РАЙЁНУ.

Жлобін. Па ўсяму Жлобінскаму райёну (Бабруйшчына) рэалізавана пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі па 25 тысяч рублёў—усе сто процантаў заданьня. Райвыканком парашыў 10 процантаў, якія застаюцца ў райбюджэце, скарыстаць на культурныя патрэбы райёну.

ВУЧОНЫЯ ПАСТУХІ.

Шклоў, 21-5. У вёсцы Гарадзішчы скончылі працу двохтыднёвыя курсы для пастухоў.

ЗАЦЯЖКА Ў БУДАЎНІЦТВЕ.

Гомель. 21-5. Будаўніцтва ў Гомелі разгортваецца слабым тэмпам. У некаторых органах і дагэтуль адсутнічае плян будаўніцтва. У зьвязку з зацяжкаю будаўнічых работ, шмат кваліфікаваных рабочых, замацаваных біржай працы да будаўнічых органаў, разьяжджаюцца. Асаблівая зацяжка заўважаецца па будаўніцтву Заходняе чыгункі.

ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАНА НА 100 ПРОЦ.

Барысаў, 19-5. Заданьне па рэалізацыі сялянскай пазыкі па г. Барысаву выканана на 100 проц.

Рэалізавана—18.000 руб.

СЬВЯТА ФІЗКУЛЬТУРЫ.

Бабруйск, 21-5. 19 і 20 мая ў Бабруйску адбылося сьвята фізкультуры. У час сьвята былі валаджаны спаборніцтвы па розных галінах фізкультуры. Сьвята прайшло пры шырокім удзеле працоўных Бабруйску.

ТРЭБА ПЕРАСЯВАЦЬ ПАПСУТАЕ ЖЫТА І КАНЮШЫНУ.

Ёсьць паасобныя мясьціны ў Менскай акрузе, дзе лапіны выпрэўшага жыта і канюшыны займаюць да 50 проц. Трэба ўжыць захады, каб сялянства засеяла гэтыя лапіны хоць-бы сэрадэляй.

АРГАНІЗАВАЛІ МАШЫННАЕ ТАВАРЫСТВА.

Ворша 21-5. Сяляне вёскі Красноўкі, Крупскага раёну арганізавалі машыннае таварыства, якому далі імя «Чырвоная Зорка». Зараз ужо запісалася сябрамі таварыства 9 гаспадароў. Таварыства набыло саламарэзку і ў хуткім часе думае купіць малатарню.

У КАЛЕКТЫВЫ.

Круглае. 21-5. Круглянскі сельсавет у справе арганізацыі арцеляў ідзе ўперадзе. Раней былі арганізаваны 2 земляробчыя арцелі; адна з яўрэйскага насельніцтва, другая з беларускага. У сучасны момант арганізавана яшчэ адна земляробчая арцель у Дарашкевічах. Зараз у сябры арцелі запісалася 14 гаспадароў.

БУДУЮЦЦА АГНЯТРЫВАЛЫЯ БУДЫНКІ.

Бабруйск, 22-5. Распачата пабудова агнятрывалага будынку пад вэтэрынарны пункт у м. Глуску. Апрача таго ў Глускім раёне распачата пабудова будынку пад школу ў вёсцы Бубноўцы. Да восені гэтыя будынкі будуць скончаны.

Як прайшоў „Дзень Лесу“ на мясцох.

У Заслаўскім р. пасеяна 35 гэкт. лесу.

Гэтымі днямі пры шырокім удзеле вайскоўцаў, камсамольцаў і школьнікаў было засеяна 10 гэкт. лесу дзяржаўнага значэньня і да 25 гэкт. у лясох мясцовага значэньня. Апроч таго, пасаджана прысады ў 24 пасёлках і значная праца праведзена па ачыстцы лесу ад ламачча.

Сіламі сялянства.

У Вузьдзенскім раёне значную працу па лесааднаўленьні праводзіць само сялянства. У Прысынкоўскім с.-с. у лесе мясцовага значэньня засеяны 1,5 гэкт., у Добрынеўскім с.-с.—0,5 гэкт. 19 мая пры ўдзеле камсамольцаў, піянэраў і школьнікаў было засеяна тры чвэрці гэкт.

На вуліцах прысады.

У Койданаве, у кампанію «Дзень лесу», была праведзена значная работа па пасадцы дрэў на вуліцах мястэчка. Пасаджаны дрэвы вакол памяшканьня РВК, бальніцы, вэтэрынарнай лячэбніцы, райкому і інш.

У лясох мясцовага значэньня мяркуецца засеяць лесам да 15 гэкт.

Чаму не праводзіцца пасадка ў Менску.

Менскі камгас да таго дайшоў, што ня мае нават пасадачнага матар'ялу, каб упрыгожыць дрэвамі вуліцы Менску. Гарсавет павінен ужыць захады, каб мець свой гадавальнік дэкарацыйных расьлін.

Пасадка леса ў Халяўшчыне.

Нядзеля.—Сонца прыпякае. Толькі зрэдка яно схаваецца са хмарку і тады на некалькі хвілін горач адляжа.

З усіх бакоў праз даліны і ўзгоркі, з ляскоў па дарожках у аколіцу «Халяўшчынскага вобчаства» кожную хвіліну прыбываюць невялічкія гурткі моладзі. Гэта вясковы камсамол і актывісты. Тут ёсьць і хлапцы і дзяўчаты.

Пасьля невялікай прамовы аб значэньні лесу, аб ролі грамадзянскай сьвядомасьці ў справе аховы лясоў, аб адносінах да лесу, як да народнага, да свайго багацьця—моладзь прыступіла да пасадкі лесу.

Баразны для засыпкі ў зямлю насеньня былі падрыхтаваны даўно. Яны заскарыніліся і дажджавая вада, якая са ўзгоркаў усплывала па іх у даліны прытрамбавала іх і прыгладзіла.

Хлопцы дружна ўзяліся за працу. Праз пару хвілін кавалкі баразён зрабіліся як пух. Дзяўчаты, панабіраўшы з мяшка насеньня ў хлапцоўскія шапкі, жменямі пасыпалі яго ў разьдзёртыя жалезнымі граблямі баразны. За дзяўчатамі па баразнах ішлі ізноў хлапцы і, хто граблямі, а хто венікамі, засыпалі насеньне.

Праца пачалася ў 11 гадзін. Праз дзьве гадзіны некаторыя хацелі зрабіць перарыў. Нехта пачаў сьмяяцца.

— Яшчэ не пасьпела ўзяцца за працу, а ўжо замарылася!

— Замарылася, замарылася... Зусім не таму, што «замарылася», а проста сьпяшаць няма куды. Хоць „замарылася“, а цябе перапрацую!

— А давай спрабуем, хто хутчэй прыстане!

І работа ізноў закіпела. Без перапынку адпрацавалі 4 гадзіны і працу скончылі.

Што значыла гэтым маладым, бадзёрым сілам, сьмяючыся і падшучваючы адзін над другім, папрацаваць 4 гадзіны? Рабілася гэта замест пагулянкі або замест бескарыснае седні ці лежні ў цяньку. За 4 гадзіны дружнай працы пасаджана пара гэктараў лесу. І прыемна, і карысна.

Усяго за тыдзень лесу ўрыўкамі пасаджана 8 з паловаю гэктараў лесу.

* * *

Цяпер некалькі лічбаў з прамовы сказанай перад пасадкаю лесу.

Па Астрашыцка-Гарадзецкаму раёну з 1927 да мая 1928 году самавольна вырубілі на 39.000 руб. лесу. Гэта па штрафных таксах. Па прадажных таксах—на 7.970 руб. Гадовая лесасека каштуе 8.000 руб.

Самыя буйныя лесапарубкі прыпадаюць на 1927 год. Цяпер самавольная рубка лесу значна зьменшылася. Вялікі ўплыў на скарачэньне лесапарубак зрабілі штрафы. Калі штраф, належачы за самавольную лесапарубку, паступаў на выкананьне праз 3 гады, эфэкту ня было. Цяпер, калі штраф выконваецца праз 2-3 месяцы, парубкі скараціліся да мінімуму.

Вялікае значэньне на культурныя адносіны сялянства да лесу зрабілі тлумачэньні, што найбольшую шкоду для лесу і для дзяржавы робяць злосныя лесапарубшчыкі. А яны робяць так: падрубаюць елку, адшчэпяць кавалак і, пабачыўшы, што колецца ня проста пакідаюць яе на пні, бо для вырабу гонты яна не падходзіць. І так штук 6—8 падрубае, а адну забярэ.

Факты і лічбы сумныя, але грамадзянская сьвядомасьць сялян павялічаецца і сумныя факты і лічбы радзеюць.

С. Азерскі.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

ДВА ТВАРЫ ПОЛЬСКІХ ГАРАДОЎ.—СЯЛЯНСКАЕ ГОРА.—БУРЖУАЗЕЯ ВА ЎЛАДЗЕ.—КІМ БЫЎ І КІМ СТАЎ ЯЗЭП ПІЛСУДЗКІ.—САЦЫЯЛ-ЗДРАДНІКІ.—ДУШЫЦЕЛІ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН.—ПЕРШАМАЙСКАЯ КРОЎ.—ЗГОДНІЦКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ НЕ ЎДАЛАСЯ.

Даволі добра аглядзець Варшаву, сталіцу Польшчы, і Лодзь, буйнейшы яе прамысловы цэнтр, каб зразумець увесь адваротны бок панскае Польшчы. Варшава на адным пэўным месцы раптам мяняе свой твар, з вельмі прыгожага і багатага гораду яна ператвараецца ў зборышча нейкіх брудных і крывых вулачак, з схіліўшыміся на бок пад цяжарам працы хібаркамі. І самае цікавае тое, што калі ў першай прыгожай і багатай Варшаве жывуць прамыслоўцы і банкаўскія тузы і абшарнікі, дык у другой--беднай Варшаве жывуць рабочыя і яўрэі.

У першай Варшаве, у зялёных на ўвесь сьвет вядомых прысадах, шырока карыстаюцца жыцьцём старыя шляхцічы і сучасныя паны, у руках якіх банкі і заводы, а ў другой Варшаве перабіваюцца чэрствым хлебам і зялёнай цыбуляй, запіваючы ўсё гэта вадою з Віслы, рабочая і яўрэйская бедната--ахвяры сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня.

Той-жа малюнак і ў Лодзі, але яшчэ больш яскрава выяўлены. Гэты горад зьяўляецца яскравым узорам таго, як можа хціва заграбаць сваю нажыву буржуазея, зусім ня думаючы аб узьняцьці культурнага ўзроўню краіны. Гэты горад зьяўляецца прамысловым цэнтрам Польшчы, там найбольш багатыя фабрыкі і заводы, працаю гэтага гораду і яго абываталяў харчуецца вялізная частка Польшчы, а панская верхавіна зьбірае сабе міліёны. Але гэты горад з насельніцтвам звыш міліёну ня мае ні каналізацыі, ня мае сталага тэатру, ніякіх культурных устаноў, бо багачы яго ня дбаюць ні аб культурных, ні аб духоўных запатрабаваньнях жыхароў гораду--рабочых і рамесьнікаў.

Гэтыя два гарады даюць самае лепшае ўяўленьне аб тэй сацыяльнай і нацыянальнай розьніцы, якая існуе ў Польшчы і складае асноўную рысу гэтае дзяржавы. Тое, што так яскрава выяўляецца ў Варшаве і Лодзі, паўтараецца і ў іншых гарадох і гарадочках, сёлах і вёсках, толькі чымся менш горад, тым больш спатыкаемся мы ўжо з сялянскім горам і бяспраўем, а нацыянальнае прыгнечаньне і нецярпімасьць накіравана ўжо не проці яўрэя, а проці беларуса ці украінца. Але асноўная рыса сучаснае панскае Польшчы—панаваньне сацыяльных і нацыянальных прыгнятальнікаў над міліённымі масамі працоўных—не мяняецца. І ў гэтым факце—асноўная рыса Польшчы; ад яе ўсе якасьці, выклікаўшыя апошнія падзеі ў зьвязку з майскай дэманстрацыяй і паходам на камуністычную партыю ў сойме.

Польская буржуазея атрымала пасьля сусьветнае вайны ўладу ва ўмовах, якім савецкія рабочыя і сяляне, захапіўшы ўладу ва ўмовах страшэннай разрухі, маглі толькі пазайздросьціць. Польшча да моманту абвяшчэньня яе незалежнай амаль зусім залячыла раны, учыненыя ёй сусьветнай вайною. Немцы, заняўшыя Польшчу, не па дабраце душэўнай, а для сваіх ваенных патрэб, моцна ўзьнялі культурны ўзровень краіны ў сэнсе пашырэньня чыгуначнае сеткі, электрафікацыі, барацьбы з заразнымі хваробамі і г. д. Незалежная Польшча пры сваім засноўваньні аказалася без адзінага гроша дзяржаўнага доўгу. Эканамічныя ўмовы былі на рэдкасьць спрыяючыя. Адным словам, нельга знайсьці ва ўсёй гісторыі чалавецтва прыкладу, каб якой-небудзь клясе давалася ў рукі ўлада пры такіх спрыяючых умовах, як польскай буржуазеі.

Але тут было ня так. Сучасная Польшча стала незалежнай пасьля таго, як польскія працоўныя, польскія рабочыя і сяляне вынесьлі на сваім карку ўсю барацьбу за вызваленьне. Тая польская буржуазея, якая цяпер так хваліцца сваёй незалежнасьцю і польскай дзяржаўнасьцю, да сусьветнае вайны і ня думала змагацца за незалежнасьць сваёй краіны і вельмі таленавіта лізала боты расейскім царам, убіралася ў камэргерскія мундзіры і атрымлівала розныя ўзнагароды і пастаўкі. Таму, атрымаўшы ў выніку сусьветнае вайны і Кастрычнікавай рэвалюцыі ў Расеі незалежнасьць, польская буржуазея зразумела, што калі яна ня ўжыве патрэбных захадаў, дык польскія сяляне і рабочыя хутка захопяць уладу ў свае рукі. Польскай буржуазеі трэба было нацкаваць рабочых на сялян, пасварыць горад з вёскай, пасварыць палякаў з нацменшасьцямі — словам, выклікаць штучна цэлы шэраг пытаньняў для таго, каб адцягнуць увагу праслоек працоўных, якія яшчэ вагаліся, асабліва дробнае буржуазеі гораду, сялян-сераднякоў ад пытаньня заваёвы ўлады ад буржуазеі, якая гэтую ўладу незаконна захапіла, карыстаючыся злачынным папусьціцельствам з боку сацыял-здраднікаў.

У гэты момант польская буржуазея высунула Язэпа Пілсудзкага.

1905 г. Да вядомага варшаўскага астрогу «Павьяк»,—куды царызм кідаў сваіх вязьняў і дзе цяпер польскія паны пораць сваіх клясавых ворагаў, карыстаючыся, дарэчы сказаць, для барацьбы з імі царскім крымінальным укладам, да таго шэрагу будынку, у якім перабывала не адно пакаленьне польскіх рэвалюцыянэраў,--пад'ехаў жандарскі афіцэр і з ім некалькі жандараў. Ён падаў начальніку астрогу тэрміновы загад аб выдачы яму на рукі дзесяці чалавек, засуджаных да кары сьмерцю для таго, каб перавесьці іх у варшаўскую крэпасьць, бо жандарская ўправа баіцца іх гвалтоўнага вызваленьня з астрогу. Начальніка астрогу гэты загад зьдзівіў, але афіцэр вымагаў найбольш хуткага выкананьня і чытаў „Новое Время“—таго часу ўлюбёную газэту царскіх катаў. І начальніку прышлося выдаць дзесяць засуджаных вайскова-палявым судом да пакараньня сьмерцю «пэпэсякаў» (членаў польскае сацыялістычнае партыі). У астрозе падумалі, што таварышоў вядуць на сьмерць, загучэлі разьвітальныя баявыя песьні, але на наступную раніцу недалёка ад астрогу знайшлі астрожную фурманку і на ёй зьвязанага фурмана, а троха пазьней зьдзіўленыя астрожнікі даведаліся, што афіцэр і яго падарожнікі былі членамі «баёўкі» ППС, што Язэп Пілсудзкі вызваліў сваіх таварышоў і выратаваў іх ад вяроўкі царскага ката.

Гэта было ў той час, як ППС змагалася за вызваленьне Польшчы рукамі польскае рабочае клясы. Калі Пілсудзкі, належаўшы да таго-ж пакаленьня, што і Фэлікс Дзяржынскі, быў блізкі да расейскага рэвалюцыйнага руху і спатыкаўся з сучаснымі бальшавікамі па астрогах і перасыльных этапах, і ніхто ня мог падумаць, што яны калі-небудзь будуць найбольш варожымі адзін другому. Але ўжо тады паявіліся першыя адзнакі таго, што ў ППС ня ўсё добра. Тэрарыстычныя лёзунгі пераважалі пад лёзунгамі масавае клясавае барацьбы, усё больш заражаліся шэрагі гэтай партыі польскім мяшчанствам, польскай сярэдняй і дробнай буржуазеяй і ўсё ясьней рабілася, што ППС за адно з контр-рэвалюцыяй, імкнучыся дамагчыся з дапамогаю польскіх працоўных незалежнасьці Польшчы, але зусім забываючы барацьбу з сваёй уласнай буржуазеяй.

Да моманту агалашэньня польскае незалежнасьці гэты працэс выцясьненьня з шэрагаў ППС рабочых і ператварэньня яе ў мяшчанскую партыю зайшоў так далёка, што ППС'ам у незалежнай Польшчы пачало не хапаць месца і адпаведнае ролі. З царызмам змагацца ўжо ня прыходзілася, ён быў ужо зьнішчан, з уласнай буржуазіяй яна змагацца не пажадала і не магла. Значыцца ёй заставалася толькі канчаткова перайсьці на бок буржуазеі і распачаць ужо адкрытую барацьбу з рабочай клясай і рэвалюцыйна-настроенымі атрадамі сялянства, ня польскага, а беларускага ці украінскага. Гэтую барацьбу ППС магла асабліва добра праводзіць, бо яна была заўсёды партыяй выключна польскай і не адчувала сымпатый да ўсяго няпольскага.

Але гэтую ролю замірэньня рабочых і масаў нацменшасьцяў узяў на сябе Пілсудзкі з сваёй арміяй і ў падзяку за гэта польская буржуазея перадала яму цалкам і поўнасьцю ўладу.

Па сьлядох Пілсудзкага пашла і ППС. Яна таксама пачала лютую барацьбу з рабочымі і сялянамі, але барацьбу гэту павяла іншымі спосабамі. Пілсудзкі змагаецца адкрыта, значыцца ППС павінна змагацца скрыта. Калі Пілсудзкі штурмуе браму ворага, дык ППС павінна ўмець адчыніць гэтую браму з унутранага боку варожага лягера. Але як ёй гэта зрабіць, калі рабочыя і рэвалюцыйна настроеныя сяляне з свайго лягеру яе выгналі, як гэта паказалі апошнія выбары ў сойм? Як ёй залезьці ў душу рабочае клясы, калі яна і слухаць яе нават ня хоча? Застаецца апошні, яшчэ царызмам выпрабаваны сродак—спрабаваць нацкаваць рабочых і сялян на яўрэяў. Гэта-ж так выгадна разагнаць першамайскую дэманстрацыю рабочых і пры гэтым пастарацца біць галоўным чынам, яўрэйскіх рабочых і пасьля на падставе гэтага факту пасварыць польскіх і яўрэйскіх працоўных.

Першамайская дэманстрацыя. Мірна праходзяць калёны рабочых на Варшаўскі Тэатральны пляц. На пляц уваходзяць аднача сна калёны дэманструючых яўрэўскіх рабочых, арганізацыйна вельмі блізкіх да сацыял-згоднікаў. І раптам пэпэсаўская «баёўка» пачынае зьбіваць абедзьве дэманстрацыі. Неяк так выходзіць, што пры гэтым больш усяго дастаецца камуністычнай дэманстрацыі, якой паліцыя апроч таго яшчэ заступае дарогу да адступленьня. (Недарма выдатнейшыя правадыры пэпэсаўцаў служаць у польскай ахранцы). Дзікі лямант зьбітых і параненых напаўняюць пляц: каты пэпэсаўцы і проста жандары ня лічацца ні з жанчынамі ні з дзецьмі. Хто бачыў, як царскія жандары разганялі натоўпы расейскіх рабочых і хто бачыў яўрэйскія пагромы з ведама паліцыі той можа сабе ўявіць «гэройскую» барацьбу пэпэсаўцаў з рабочымі Варшавы першага мая.

І ўсё-ж пэпэсаўская правакацыя не ўдалася. Паводзіны прадстаўнікоў нацменшасьцявага сялянства ў сойме, калі разглядалася пытаньне аб выдачы суду камуністычнага дэпутата Сахацкага, даводзяць, што ні Пілсудзкаму, ні ППС не ўдалося ўзбудзіць варожасьць паміж польскімі працоўнымі і беларускімі і украінскімі сялянамі. Наадварот, нацыянальны і сацыяльны прыгнёт аб'яднаў іх яшчэ мацней. Гэта ня важна, што Пілсудзкі перамагае ў сойме. Ніхто ніколі не разьлічваў на тое, што гэты сойм, дзе старшынёй зьяўляецца сацыял-здраднік Дашынскі, бліжэйшы супольнік Пілсудзкага, можа ў чым-небудзь пярэчыць польскаму дыктатару. Але за сьценамі сойму ствараецца моцны блёк з працоўных усіх нацый, насяляючых тэрыторыю Польшчы. І тое, што адбываецца ў апошні час у Польшчы, паказвае, што здрадніцкая тактыка пэпэсаўцаў, якія спрабавалі ўзарваць гэты саюз унутры, не ўдалася. Прыдзецца Пілсудзкаму адкрыта змагацца пры дапамозе грубай, лютай сілы. Што з гэтага выйдзе, пакажа будучыня. Ня так лёгка прыдушыць рэвалюцыйную волю і энэргію бязьмерна эксплёатуемых і прыгнечаных польскіх рабочых і сялян.

В. УЛАСАЎ.

БЕЛ. ДЗЯРЖ. ВАНДРОЎНЫ ТЭАТР—У ПОЛАЧЧЫНЕ.

Пасьля 17-ці пастановак у г. Полацку, тэатр выправіўся на раёны. Згодна выпрацаванага з Полацкім АВК пляну—тэатр павінен абслужыць 18 раёнаў, самых далёкіх і глухіх.

Першым прыпынкам тэатру—вялікае сяло Белае. Там узварухнулася сялянства, калі пачула аб тым, што павінен прыехаць тэатр.

Ня гледзячы на дрэннае надвор'е, сялян наехала і прыйшло столькі, скольки ня мог умясьціць будынак нардому.

Бедната дапушчалася ў тэатр бясплатна, а так білеты аплачваліся па 20 кап. Першыя рады пазаймалі старыя сяляне і сялянкі якія прыйшлі паглядзець на дзіва, як казалі, хоць перад сьмерцю.

З нецярплівасьцю чакаюць калі распачнецца спэктакль. На сам перш яны чакаюць Галубка, пра якога ведаюць ад сваіх дзяцей.

Тав. Галубок гавора аб беларускім тэатры. Яго спаткалі гучнымі воплескамі.

Пачынаецца спэктакль «Ганка».

У залі цішыня асаблівая—апёршыся на кійкі барадачы ловяць кожны рух, кожнае слова. Усё ім зразумела.

Антракты хаця і ёсьць, але ніхто з месц ня выходзе.

У залі паветра немажлівае, лямпы мігцяць, вось-вось згаснуць.—Артыст заплывае потам, а глядач сядзіць не зварухнецца, квапна ўглядаючыся, ці хутка зноў адчынецца заслона.

Селькор Валь.

ПРАЦА РЭАРГАНІЗАВАНАГА САВЕЦКАГА АПАРАТУ.

(Згодна пастановы ЦКК НК РСІ Бел.)

Мінулы год адзначыўся значнай рэарганізацыяй савецкага апарату БССР. Праца пашла ў напрамку дэцэнтралізацыі адміністрацыйных функцый, зьнішчэньня раўналежнасьці паміж асобнымі ўстановамі, скарачэньня справаздачнасьці і спрашчэньня структуры апарату.

Большасьць Наркаматаў была пераведзена на функцыянальную сыстэму. З прычыны перадачы асноўных функцый адміністраваньня РВК і Гарсаветам удалося значна спрасьціць функцыі і пабудову акруговага апарату, перавёўшы шэраг аддзелаў акрвыканкому на становішча інспэктур.

Абсьледваньне працы рэарганізаванага апарату мела мэтай выявіць: 1) ці праведзена рэарганізацыя, у якой ступені і з якімі вынікамі, 2) неабходнасьць унясеньня карэктыў, 3) магчымасьць далейшага спрашчэньня апарату.

Абсьледваньне, у якім прынялі ўдзел АКК РСІ і савецкая грамадзкасьць, паказала мэтазгоднасьць праведзенай рэарганізацыі. Спрасьцілася структура апарату, зьменшылася колькасьць інстанцый (асабліва па ўзгадненьням) пры праходжаньні пытаньняў, палепшылася якасьць працы, яе прадукцыйнасьць, устаноўлена вялікая адказнасьць непасрэдных выканаўцаў; нарэшце, зьменшылася значна перапіска.

Але поруч з гэтым заўважан шэраг скажэньняў асноўнай лініі, узятай у гэтым напрамку ЦКК РСІ.

Трэба, бязумоўна, адзначыць, што калі мы ў шэрагу выпадкаў маем нязначны зрух з мінулага году, дык гэта зьяўляецца ў большасьці выпадкаў у выніку або невыкананьня пастаноў НК РСІ або іх скажэньня, а таксама слабага кіраўніцтва гэтай працай з боку Наркаматаў. Напрыклад, у шэрагу акругаў не праведзена пастанова НК РСІ аб перадачы Гарсаветам працы па сацыяльнаму забясьпечаньню.

Асабліва недапушчальныя зьявішчы адзначаюцца ў адносіне статыстычнай справаздачнасьці. Ня гледзячы на катэгарычныя ўказаньні, у шэрагу выпадкаў сустракаем ня вельмі старанную творчасьць, патрабаваньне новых вестак, не пагоджаных з РСІ як шляхам устанаўленьня ў афіцыйным парадку гэтых дадатковых вестак, так і шляхам патрабаваньня іх праз таварыскія запіскі.

Правы і абавязкі асноўных функцыянэраў, адказных выканаўцаў Наркаматаў і інш. устаноў ня вызначаны. Адсутнасьць выразнага размежаваньня функцый прымушае Наркома займацца дробязямі, што зацягвае вырашэньне пытаньняў і стварае ўражаньне аб немагчымасьці для Наркома кіраваць вялікай колькасьцю функцыянэраў.

Наглядаецца таксама і тое, што Наркаматы, зусім забываючы аб рэарганізацыі акруговага апарату, прад'яўляюць да іх такія-ж патрабаваньні, як і раней і ня хочуць адмовіцца ад дробнай апекі, ад умешваньня ва ўсе дробныя справы.

Трэба таксама адзначыць, што пасыўныя адносіны апарату, якія наглядаліся ў мінулым годзе ня зьнішчаны і да сучаснага моманту. Гэта выявілася ў тым, што шэраг пастаноў НК РСІ праведзен толькі фармальна.

Напрыклад, пры абмеркаваньні функцыянальнай сыстэмы на тэхнічнай нарадзе ў Менскім акрфа—„супроць гэтай сыстэмы паўстала шмат працаўнікоў акрфа, якія даводзілі, што яна няжыцьцёва і ня можа быць ужыта ў нашых умовах; і нарада выказалася супроць правядзеньня ў жыцьцё гэтай сыстэмы".

На нарадзе акруговых працаўнікоў пры Полацкім акрвыканкоме ўпаўнаважаны РСІ зазначыў: «У правядзеньні рацыяналізацыі з боку кіраўнікоў устаноў сустракаюцца значныя перашкоды і кансэрватызм.

Пасыўнае супраціўленьне выявілася ў тым, што з боку значнай колькасьці ўстаноў зусім не пададзена канкрэтных прапаноў аб магчымасьці далейшага спрашчэньня працы, дэцэнтралізацыі функцый і г. д.

На запытаньне па тэлефону аднэй установы аб неабходнасьці прадставіць меркаваньні аб магчымасьці спрашчэньня працы, мы ад сэкратара гэтай установы атрымалі наступны адказ; «Яшчэ рацыяналізаваць? Ды ў нас ужо няма чаго, бо ўсё рацыяналізавана на 100 проц.».

Гэты погляд глыбока памылковы і зганьбаваны нашай партыяй. Пленум ЦКК КП(б)Б, Сэсія ЦВК БССР, даючы ацэнку праведзенай працы, не адзін раз падкрэсьлівалі, што зроблены толькі першыя крокі, што мы павінны шмат гадоў упарта працаваць, каб яшчэ больш палепшыць справы кіраўніцтва.

Якія былі пастановы ЦКК КП(б)Б па гэтаму пытаньню?

Асновай пастановы НК РСІ па гэтаму пытаньню зьяўляецца ўдакладненьне новай сыстэмы працы і пабудовы апарату.

Дадзены асноўныя палажэньні аб парадку арганізацыі працы ва ўстановах, аб размежаваньні функцый і кампэтэнцыі функцыянэраў, аб іх узаемаадносінах з кіраўнікамі ўстаноў, аб парадку праходжаньня пытаньняў і г. д.

Дадзена дырэктыва аб складаньні наказаў і інструкцый аб парадку працы ўстановы і паасобных працаўнікоў.

Апроч таго выявілася магчымасьць далейшага палепшаньня працы і далейшага спрашчэньня апарату.

Па акруговаму апарату ўхвален таксама шэраг новых пастаноў. З Сэкратарыяту Акрвыканкому выдзелены інструктары, якія будуць непасрэдна падпарадкаваны Прэзыдыуму Акрвыканкому. У Сэкратарыяце-ж згрупавана тэхнічнае абслугоўваньне інспэкцый Акрвыканкому. Ухвалена пастанова аб пашырэньні практыкі (і праваў) індывідуальных пастаноў розных адміністрацыйных (у адносіне да апарату Прэзыдыуму АВК) і розных дробных пытаньняў старшынёй Выканкому.

Праведзена значная праца па размежаваньні функцый між НК Унутраных Спраў АВК у адносіне кіраўніцтва папраўчымі дамамі, прычым за НК Унутраных Спраў засталося толькі агульнае кіраўніцтва, агульнае заканадаўства, рэгуляваньне і пераразмеркаваньне зьняволеных; непасрэднае-ж кіраваньне месцамі зьняволеньня (уключаючы назначэньне начальнікаў гэтых дамоў) перадаецца акрвыканкомам.

НК РСІ прызнала таксама неабходным для зьнішчэньня раўналежнасьці ў дарожнай справе, аб'яднаць яе ў адным органе.

Рэарганізуецца таксама тэхнічны нагляд за будаўніцтвам. Ён аб'ядноўваецца з органамі эканамічнага рэгуляваньня і пляваньня. Таму пры АВК замест акруговых інжэнэраў арганізуюцца акруговыя інспэкцыі па будаўнічаму кантролю.

Зроблена размежаваньне працы ў акрза, акрфа. У сувязку з канчатковай перадачай РВК дзяржаўнай зямельнай маёмасьці, адпаведныя ячэйкі пры акрза ліквідаваны.

Што-ж яшчэ застаецца зрабіць?

Далей неабходна штодзённая праца ўсёй партыйна-савецкай грамадзкасьці. ЦКК РСІ сваё слова сказала. Цяпер чарга за кіраўнікамі ўстаноў.

Погляд на рацыяналізацыю апарату, як на добра праведзеную кампанію, не павінен мець месца.

Працы яшчэ шмат наперадзе і мы яе здолеем зрабіць пры калектыўнай напружанай працы.

Я. РАКАЎ.

9-ая гадавіна № Самарскай дывізіі.
ЯЕ ГЭРАІЧНЫ ШЛЯХ.

1918 г. Пад лютым напорам афіцэрскіх палкоў Таманская армія чырвоных, якая самаахвярна бараніла працоўнае казацтва і сялянства Каўказу ад напору Каледзіна, Карнілава і інш. павінна была выйсьці з „каўкаскага мяшка" — да Астрахані. Армія цярпела голад, напаваў тыфус, нічога не даставалася ёй. Шлях адступленьня: паходным парадкам праз Кіргіскія стэпы і Астрахана-Касьпійскую пустыню—да Астрахані. Адступленьне было цяжкае. Людзі паміралі на кожным кроку ад голаду, тыфусу, ад марозаў.

У красавіку 1919 г., з тых, што засталіся жывымі, разам з іншымі часьцямі была сфармавана № кав. дывізія, якая і апэравала ў Паваложжы. Найбольш моцныя бойкі ў гэты час былі за горад Астрахань. За ўдалыя апэрацыі два палкі нашай дывізіі атрымалі па чырвонаму ганароваму сьцягу ад УсеЦВК. А далей—Самарскія стэпныя шляхі. Пад дутаўскім сьцягам напірае сібірскае кулачно на Самарскую губэрню. Дывізія сустракаецца з дутаўцамі каля селішча Жыткур і ўдалым наскокам разганяе, разьбівае ворага. Рэвалюцыйны вайсковы савет узнагароджвае дывізію за гэту апэрацыю ганаровай назвай „Самарскай". 1920 г. Армія Дэнікіна адступае да берагоў Чорнага мора. Прасьледваючы ворага, байцы дывізіі варочаюцца ў родны край. Адна з груп дывізіі захапляе гор. Стаўропаль з багатымі трафэямі і пяць тысяч палонных. Другая група займае Кізьляр і адбівае ў белых шмат вайсковай маемасьці.

Разьбіўшы бэка-ханскія банды ў Азэрбайджане, улетку 1920 г. дывізія перакідаецца на ўрангелеўскі фронт і ў лістападзе гэтага-ж году разам з перадавымі чырвонымі часьцямі ўрываецца, праскочыўшы ўмацаваныя перакопскія пярэсмыкі, у гняздо Урангеля—у Крым, дзе, прасьледваючы ў паніцы ўцякаючага ворага, захапляе багатыя трафэі.

1921 г. Дывізія, вельмі парадзеўшая ў бязупынных бойках, зьліваецца з 5 кубанскай дывізіяй. 5 кубанская кав. дывізія фармавалася ў верасьні 1920 г. Разграміўшы бела-зялёныя банды пад Майконам, Кубанскае вобласьці, заняўшы горад Бэрдзянск, 5-я кубанская дывізія робіць гістарычны абход ва ўрангелеўскі тыл, нападае на гор. Токмак, дзе захапляе, багатыя трафэі, узрывае вагоны з снарадамі, чым і дапамагае прасоўваньню чырвонага фронту.

Крым стаў Чырвоным, але гуляе бандыт бацька Махно па Украіне—тэрарызуе працоўнае насельніцтва. Дывізія ў працягу ўсяго 1921 году бязупынна прасьледавала банды атаманаў—Махно, Шчуся, Залатога Зуба, Цюцюніка і інш. А ў часе адпачынку ў сёлах Украіны вяла жвавую дзейнасьць па ўмацаваньню савецкай улады. У жніўні 1921 году дывізія паходным парадкам пераходзіць на правабярэжную Украіну, дзе ўдалым наскокам пад сялом Мікалаеўкай разьбівае банду ў 200 махноўцаў. Маленькая група ў 25-30 чал. бандытаў разам з Махно ўцякае ў Румынію.

А далей вучоба, вучоба і вучоба.

9 гадоў стаіць на варце дывізія. Старыя байцы паехалі ў бястэрміновы водпуск. Маладыя захоўваюць заветы і традыцыі старэйшых—быць гатовымі ў любы момант да бойкі з ворагамі працоўных.

Абавязкі камандзіра рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

(Да камплектаваньня вайсковых школ).

Моц і баяздольнасьць Чырвонай арміі ў значнай меры залежыць ад якасьці яе каманднага складу. Вось чаму падрыхтоўка камандзіраў і палітпрацаўнікоў зьяўляецца аднэй з галоўнейшых задач у справе ўзмацненьня Чырвонай арміі.

Адгэтуль зразумела тая роля, якую адыгрывае каманды склад Чырвонай арміі; адгэтуль яскрава відаць адказнасьць тэй задачы, якая ўскладаецца на чырвонага камандзіра.

Кім ён павінен быць?—Камандзір Чырвонай арміі гэта—сапраўдны выканаўца волі рабочай клясы, яе партыі і ўлады ў справе выхаваньня чырвонай арміі, у справе падрыхтоўкі і наданьня ёй неабходнай баяздольнасьці. Камандзір Чырвонай арміі навучае вайсковай справе чырвонаармейцаў, усіх грамадзян і кіруе падрыхтоўкай краіны да абароны.

Ён павінен павесьці, калі гэта патрэбна будзе, у бойку з капіталістымі рабочых і сялян. Будучы палітычным выхавацелем і кіраўніком чырвонаармейцаў, актыўным культурным і грамадзкім працаўніком, камандзір Чырвонай арміі павінен быць актыўным удзельнікам усяго сацыялістычнага будаўніцтва.

Абараняючы СССР—апору сусьветнай рэвалюцыі, камандзір Чырвонай арміі тым самым ахоўвае інтарэсы працоўных мас усяго сьвету; вось чаму яго значэньне і роля надзвычайна вялікая і ганаровая як сярод працоўных СССР, гэтак пралетарыяў прыгнечаных усяго сьвету.

Чырвоная армія адзіная пакуль-што ў сьвеце, у якой клясавыя інтарэсы каманднага складу зусім аднолькавыя з інтарэсамі ўсіх чырвонаармейцаў. Такім чынам уся чырвоная армія клясава аднастайна і камандныя яе кадры вылучаюцца з рабоча-сялянскіх гушчаў.

Усімі гэтымі, надзвычайна важнымі адзнакамі, Рабоча-Сялянская Чырвоная армія вельмі адрозьніваецца ад усіх буржуазных армій. У гэтай розьніцы, у гэтых адзнаках Чырвонай арміі ўся сіла, уся магутнасьць яе і перавага перад імпэрыялістычнымі арміямі, для якіх інтарэсы рабочых, сялян і прыгнечаных зьяўляюцца чужымі і незразумелымі.

У праўавых адносінах камандзір Чырвонай арміі той самы, што і чырвонаармеец. Ён ня мае тых выключных праў, якімі карыстаецца ахвіцэрскі склад у буржуазных краінах. У рабоча-сялянскай краіне аднастайнасьць і роўнасьць праў камандзіра і чырвонаармейца, а таксама і ўсіх працоўных, яднае і зблізкае Чырвоную армію цалкам з працоўнымі масамі.

Тое самае магчыма сказаць і адносна матэрыяльнага становішча чырвонага камандзіра: яно наогул гэткае, як і становішча рабочага.

Вядома, што зарплата нашага камандзіра значна меншая акладаў ахвіцэрскіх і генэральскіх чыноў капіталістычных армій; тым ня менш за апошнія некалькі год удалося савецкаму ўраду палепшыць эканоміку чырвонага каманднага складу. Няма ў нас і тэй вялікай розьніцы ў акладах, якая наглядаецца ў капіталістычных краінах паміж вышэйшым і ніжэйшым ахвіцэрскім чынам. Найвышэйшы аклад пэнсіі ў нас 225 руб., а камандзір узводу, адразу пасьля скончэньня вайсковай школы, атрымлівае каля 90 руб.

Хто-ж падрыхтоўвае і дае камандныя кадры Чырвонай арміі?

Гэтую задачу выконваюць вайсковыя школы. Задачай вайсковай школы зьяўляецца падрыхтоўка сьвядомага камандзіра, палітычнага кіраўніка, які стаяў-бы на ўзроўні сучаснай тэхнікі, які ажыцьцяўляў-бы дырэктывы камуністычнай партыі і савецкай улады, які адважна і сьмела пашоў-бы ў належны момант у рашучую бойку з клясавым ворагам і павёў-бы за сабою рабочыя і сялянскія масы.

Для ажыцьцяўленьня гэтай задачы неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на падбор моладзі ў час залічэньня яе ў вайсковую школу з пункту погляду сацыяльнай прыналежнасьці жадаючых паступіць у школу. Рабочая кляса павінна мець у камандным складзе магчыма больш процант рабочых.

Падрыхтоўчую працу да прыёму ў вайсковыя школы зараз неабходна разгарнуць і павесьці гэтакім парадкам, каб прамысловыя рабочыя мелі палавіну ўсяго складу школы.

Разам з гэтым узрастаюць агульна-культурныя і адукацыйныя запатрабаваньні да жадаючых паступіць у школу. У гэтым сэнсе найбольш пажаданымі кандыдатамі зьяўляюцца рабочыя і сяляне (беднякі, сераднякі), скончыўшыя рабфакі і сямігодкі. Патрэбна таксама значная падрыхтоўка, наогул, дзеля больш пасьпяховай працы ў вайсковай школе. Для кандыдатаў, паступаючых у Беларускую Аб'яднаную Вайсковую Школу ЦВК, абавязкова, апроч таго, добра ўладаць і беларускай мовай.

Кожнаму жадаючаму паступіць у вайсковую школу трэба загадзя ўзважыць сваю здольнасьць да выкананьня тых адказных задач, якія будуць ускладзены рабочай клясай і камуністычнай партыяй на яго па скончэньні ім школы, як на камандзіра Чырвонай арміі.

Такім чынам, запатрабаваньні к чырвонаму камандзіру надзвычайна вялікія. Трэба настолькі быць падрыхтаваным, каб у школе здолець у нядоўгі тэрмін атрымаць значныя тэарэтычныя веды, увідзіць практыку і тэхніку вайсковай справы, арганізацыю і выкананьне ўзброенай барацьбы. Разам з гэтым чырвоны камандзір павінен стала набыць галоўныя грамадзка-палітычныя веды і падрыхтавацца да ролі кіраўніка чырвонаармейцаў.

Той, каму давядзецца паступіць у вайсковую школу, павінен памятаць, што галоўнымі адзнакамі камандзіра Чырвонай арміі зьяўляецца любасьць да вайсковай справы, адважнасьць і здольнасьць ахвяраваць свае жыцьцё пры выкананьні баявых задач. Гэтыя рысы камандзіра павінны падмацоўвацца яшчэ бязумоўнай адданасьцю камуністычнай партыі і савецкай уладзе і інтарэсам сусьветнай рэвалюцыі.

А. Сташэўскі.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.
„Чаго яна ящо хотіт"?

Было неяк, што над аднэй западозранай у калдаўстве бабулькай сельсавет афіцыйна рабіў дасьледваньне, з мэтаю высьвятленьня месца знаходжаньня бабулькінага хваста.

Хваста ў бабкі, па чутках, не знайшлося, але бабка затое некалькі разоў паказала мясцовай уладзе тое месца, адкуль па падазрэньню мясцовай улады павінен быў расьці бабулькін хвост.

Пасьля гэтага мясцовая ўлада агледам была канчаткова задаволена і алібі бабкі была даведзена.

Прыводжу другі канфлікт ужо не вясковага старшыні з западозранаю ў вядзьмярстве бабкаю, а Расьнянскай райміліцыі з аднэю жанчынаю, якая ўжо трэці год ходзіць у райміліцыю, каб ёй дапамаглі па выканаўчаму лісту атрымаць грошы.

За ўсе гэтыя тры гады жанчына ні да чога не дайшла, калі вядома, ня лічыць афіцыйнай даведкі, якую атрымала гэная жанчына ад райміліцыі.

Вось зьмест гэтай даведкі.

Літаральна:

Даведка.

«Бабе гэтай растлумачана, што ея ліст знаходзіцца ў судебного выканаўцы а міліцыя цяпер зусім за аліменты неузыскаець, а чаго яна ящо хотіт то невядома».

За Начрайміліцыі (подпіс).

З гэнай даведкі відаць, што «баба» нечага «ящо хотіт», а чаго—міліцыі гэтага быццам і невядома.

Таварышы з райміліцыі!

Доўга мы ў рэдакцыі, чытаючы гэную даведку, думалі:

— І чаго, думалі, сапраўды хоча гэная цётка тры гады ходзячы ў міліцыю... Але, нарэшце, мы рашылі:

... Ма'быць ці ня хоча цётка паказаць райміліцыі адкуль у ведзьмаў хвост расьце.

... І пакажэце, цётка, дальбог пакажэце, бо райміліцыянэр, які даў гэткую даведку, большага і ня варты.

Алёша.

Што зроблена для палепшаньня якасьці экспарту?

На гэта запытаньне можна з чыстым сумленьнем адказаць: вельмі мала:

І сапраўды, ня гледзячы на тое, што на гэта пытаньне неабходна было зьвярнуць асабліва сур'ёзную ўвагу, да апошняга часу нашы экспартуючыя арганізацыі атрымліваюць цэлы шэраг рэклямацый на неадпаведную якасьць таго ці іншага тавару, ды ня толькі самага тавару, але і тары (скрыні, мяшкі, кадушкі і інш.), у якой знаходзіцца экспартуемы тавар.

Бясспрэчна, у гэтай галіне сёе-тое дасягнута, але замежныя фірмы хочуць мець тавар зусім дабраякасны, тару моцную і ў поўным парадку. Неабходна падкрэсьліць, што, апроч страт, якія маюць экспартуючыя арганізацыі з прычыны дрэннай сартыроўкі, перапрацоўкі ці ўпакоўкі тавару, аўтарытэт беларускага тавару падае, і цэны тады яшчэ больш зьніжаюцца. Ня трэба забываць, што найменшы дэфэкт у таварах за межамі пераўвялічваюць, каб выйграць у цане. Але бываюць факты зусім правільныя, калі нашы гандлёвыя прадстаўніцтвы прысылаюць назад пробы тых тавараў, якія экспартавалі для высьвятленьня.

Да гэтага часу грыбы пасылаліся ў неадпаведнай тары, сартыроўка была слабая, маркіроўка нядбайная і г. д. Замежны пакупец надае аднолькавае значэньне як тавару, так і тары, у якой знаходзіцца тавар, бо ад правільнай тары захоўваецца лепш тавар.

Цікава тое, што пры жаданьні, пры сур'ёзным падыходзе да справы можна было зрабіць усё, згодна стандарту, згодна тых патрабаваньняў, якія прад'яўляюць замежныя фірмы.

Яшчэ 2 гаду таму назад яйкі, што накіроўваліся ў Нямеччыну, выклікалі вялікія нараканьні: тара была няспраўная, тавар нячысты (хоць і добрай якасьці), і пасьля прынятых мер у мінулым годзе сёлета экспартуемыя яйкі на замежным рынку ўжо ня выклікаюць ніякіх нараканьняў. Тое-ж самае з яблыкамі. Для экспарту яблык патрэбна добрая тара і самая акуратная сартыроўка. Гэта-ж і з грыбамі і з іншымі таварамі. Нашы рэгулюючыя органы павінны зьвяртаць на гэта самую сур'ёзную ўвагу, бо ад гэтага залежыць рэнтабельнасьць нашага экспарту.

Поруч з выяўленьнем новых відаў экспарту, поруч з імкненьнем да ўзмацненьня экспарту з БССР неабходна рашуча і настойліва паставіць пытаньне аб палепшаньні якасьці тавару, палепшаньні стандарту, вырабу тары згодна патрабаваньня рынку, і тады цэны на нашы тавары павысяцца.

Л. Манін.

3-ці ўсебеларускі зьезд інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў.

У нядзелю, 20 мая, на зьездзе разгарнуліся спрэчкі па дакладах Беларускага і Усесаюзнага Міжсаюзнага Бюро Інжынэраў і Тэхнікаў.

Дасягненьні ў працы за апошнія 2 гады былі і ёсьць, гэта падкрэсьлівалася прамоўцамі, але галоўная ўвага працаўнікоў з месц была накіравана на недахопы, якія ў далейшай працы трэба выправіць.

Аб чым-жа гаварылі і на што ўказвалі працаўнікі месц?

Галоўны недахоп тое, што нашы прафсаюзныя арганізацыі аддаюць мала ўвагі інжынэрна-тэхнічным працаўнікам. Ня толькі прафарганізацыі, але і нашы гаспадарнікі таксама вельмі мала цікавяцца працай сэкцый. Да прыкладу, на Гомельскую акруговую канфэрэнцыю інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў было паслана 50 запрашальных білетаў, але ніхто з чырвоных дырэктароў не зьявіўся.

Вы думаеце лепш справа ў Менску? Мыляецеся, бо на сучасны зьезд было паслана 100 запросін; у дзень адчыненьня зьезду некалькі гаспадарнікоў прысутнічала. а вось, калі пачалася праца зьезду, калі нашы чырвоныя дырэктары і гаспадарнікі маглі-б пачуць на зьезьдзе голас інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, дык нікога з гаспадарнікаў ня было відаць.

У далейшым нашым прафарганізацыям і гаспадарнікам трэба больш увагі аддаваць нашым спэцыялістам і працы іх сэкцый,—аб гэтым гаварылі ўсе выступаўшыя таварышы.

Адзначалася ў спрэчках слабая праца сэкцый, але, на думку выступаўшых, уся бяда у тым, што вінавата тут перагружанасьць працай спэцыялістаў. Трэба вызваліць ад лішняй нагрузкі працаўнікоў бюро сэкцый і даць сродкі на ўтрыманьне хоць аднаго платнага працаўніка.

Слаба стаіць справа і з беларусізацыяй як усебеларускага, так і акруговых бюро. Праўда, у сэкцыях спэцыялістаў, якія маюць дачыненьне да сельскай гаспадаркі, у галіне беларусізацыі ёсьць дасягненьні; усім-жа іншым сэкцыям і працаўнікам трэба падцягнуцца.

З выступленьняў на зьезьдзе відаць, што вышэйшы тэхнічны пэрсанал недастаткова кіруе работай стажораў. Студэнты ў ВУЗ'ах робяць усё магчымае, каб набыць максымум тэарэтычных ведаў; трэба нашым старым спэцыялістам перадаць сваім маладым таварышам і свой шматгадовы вопыт. Ёсьць яшчэ частка спэцыялістаў, якія ня хочуць дзяліцца з моладзьдзю сваім вопытам, баючыся, відаць, канкурэнцыі.

З гэтай недарэчнасьцю неабходна весьці барацьбу. Перад намі стаіць важная задача—падрыхтаваць добрую зьмену, новы кадр кваліфікаваных спэцыялістаў.

Гаварылася і аб тым, што перагружанасьць спэцыялістаў не дае ім магчымасьці прымаць больш шырокі і актыўны ўдзел у грамадзкай працы. Прыводзіліся прыклады, калі, часам, спэцыялісты, замест працы па вытворчасьці, сядзяць у канцэлярыях.

Хворае пытаньне для нашых спэцыялістаў і стракатасьць ставак па асобных спэцыяльнасьцях, і новаму Беларускаму Міжсаюзнаму Бюро інж. і тэхн. на гэта прыдзецца зьвярнуць увагу і, па магчымасьці, падцягнуць адсталыя групы працаўнікоў.

Наогул, не засталося ніводнага пытаньня саюзнай працы, якое ня было-б закранута ў спрэчках.

Спрэчкамі і была скончана праца зьезду 20 мая.

На гэтым-жа пасяджэньні была вынесена рэзалюцыя-пратэст супроць зьдзекаў фашысцкага ўраду Польшчы над працоўнымі Заходняй Беларусі.

Важнейшыя зьмены у законе аб с.-г. падатку.

У новым законе аб с.-г. падатку ёсьць шэраг момантаў, якія значна адрозьніваюць яго ад закону мінулага году.

Гэта не маленькія папраўкі, якія мы мелі ў законе мінулых гадоў,—гэта, паўтараем, вялікія зьмены, якія бясспрэчна, сустракаюць шмат цяжкасьцяй пры іх ажыцьцяўленьні. Да гэтых цяжкасьцяй мы павінны быць падрыхтаваны, аб іх неабходна ведаць усім, хто ў бліжэйшы час будзе прымаць удзел у правядзеньні кампаніі.

Перш за ўсё трэба мець на ўвазе асноўныя задачы, якія ставіць новы закон. Іх дзьве.

Першая—больш правільны і больш поўны вучот прыбыткаў ва ўсіх гаспадарках і другая—павышэньне цяжкасьці абкладаньня моцных і, у прыватнасьці, кулацкіх гаспадарак. Гэтыя задачы па сутнасьці ня новыя. Яны ставіліся і законамі мінулых гадоў. Розьніца толькі ў мэтадах іх вырашэньня.

У новым законе гэтыя мэтады асьвятляюцца з больш значнай поўнасьцю і выразнасьцю, чым у ранейшых законах.

На працягу апошніх двух год падаткам абкладаецца ўвесь прыбытак сялянскага двара—ад зямлі, жывёлы, садоў, гародаў і неземляробчых заработкаў. Гэтая сыстэма абкладаньня апраўдала сябе. Сялянства ў пераважнай большасьці прызнала яе правільнай і жыцьцёвай. Але разам з тым шэраг эканамічных і палітычных зьявішчаў з жыцьця вёскі пачалі ў апошні час сыгналізаваць недахопы закону. Стала зусім відавочным, што добрая па сутнасьці сыстэма абкладаньня паступова пазбаўляецца асноўнай сваёй якасьці—„якасьці вельмі важнага інструмэнту для зьмены сацыяльна-эканамічнай структуры сялянства". (М. Калінін).

Зьмены, унесеныя ў новы закон, накіраваны да таго, каб сыстэма зноў набыла іменна гэтыя якасьці. Вядома, што абкладаемы прыбытак сялянскіх гаспадарак ад зямлі, жывёлы і дробных галін устанаўляецца па раней выпрацаваных нормах прыбытку. Калі, напрыклад, норма прыбытку з дзесяціны ральлі для сельсавету ўстаноўлена ў 30 руб., дык прыбытак ральлі ўсіх сялянскіх гаспадарак сельсавету вызначаецца па гэтай норме. Таксама ўстанаўляецца прыбытак ад жывёлы і спэцыяльных галін. Хто выйграе ад такога парадку вылічэньня абкладаемага прыбытку? Выйграюць моцныя гаспадаркі, якія атрымліваюць значна большы прыбытак ад памянёных крыніц, чым серадняцкія і бядняцкія гаспадаркі, прыбытак якіх амаль заўсёды адпавядае ўстаноўленым нормам.

Новы закон, напершае, устанаўляе, што прыбытак кулацкіх гаспадарак вызначаецца не па нормах, а ў індывідуальным парадку, і, падругое, што прыбытак гаспадарак, пачынаючы ад 400 руб., г. зн. у нашых умовах досыць моцных, устанаўляецца па нормах, але да ўсяго вылічанага прыбытку (па нормах) робяцца цьвёрдыя процантныя надбаўкі.

Гэтай зьменай закону пытаньне аб поўным ахапленьні прыбытку паасобных сялянскіх двароў яшчэ не вырашаецца. Усё яшчэ для большасьці гаспадарак застаюцца нормы і нарматыўныя папраўкі. Але затое класавая сутнасьць закону значна ўдакладняецца. Невялічкая група кулацкіх гаспадарак абкладаецца іншым парадкам—да гэтай групы гаспадарак ніякія нарматыўныя паказальнікі не прыстасоўваюцца. Абкладаемы прыбытак усіх астатніх моцных гаспадарак зьмяняецца шляхам ужываньня надбавак.

На меры набліжэньня абкладаемага прыбытку ў памянёных катэгорыях гаспадарак да іх фактычнага прыбытку будзе дасягнута, з пункту гледжаньня клясавай прыроды савецкага падатковага заканадаўства, больш правільнае абкладаньне іх падаткам.

Гэта важнейшая частка новага закону, на якую неабходна зьвярнуць увагу насяленьня пры правядзеньні агітацыйнай кампаніі. Яна не датычыць ўсёй бядняцкай і большай часткі серадняцкага насяленьня вёскі. Аб гэтым трэба цьвёрда памятаць. Прызначэньне яе—павялічыць абкладаньне заможнай часткі вёскі да разьмераў, у поўнай меры адпавядаючых яе плацежаздольным сілам.

Вельмі цяжка будзе зрабіць адбор гаспадарак, прыбытак якіх павінен быць вызначан індывідуальным парадкам. Якія-ж гэта гаспадаркі? Па якіх адзнаках павінен быць зроблен іх адбор? На падставе якіх даных вызначаецца іх прыбытак? На ўсе гэтыя пытаньні неабходна мець самы падрабязны адказ, бо інакш небясьпека нежаданага перагінаньня ў гэтай справе пагражае скажэньнем правільнай палітычнай устаноўкі пытаньня.

Артыкул 28 закону гаворыць, што індывідуальным парадкам вызначаецца прыбытак у гаспадарках, якія «выдзяляюцца з агульнай сялянскай масы пэўнай мясцовасьці сваёй прыбытковасьцю і пры гэтым непрацоўным яе характарам».

Інструкцыйныя ўказаньні ўносяць у гэтае пытаньне яшчэ больш яснасьці. У іх указваецца, што да гэтай групы гаспадарак адносяцца гаспадаркі, належачыя да эксплёататарскай групы сяла і маюць прыбыткі непрацоўнага характару, якія не падаюцца вучоту па надворных адзнаках, як нелегальная скупка і продаж, ліхвярства, аддача машын у карыстаньне іншым гаспадаркам на кабальных умовах, вядзеньне сельскай гаспадаркі пры дапамозе наёмных рабочых ці іншыя гэткія-ж непрацоўныя прыбыткі.

З гэтага пераліку адзнак відаць, што гутарка ідзе не аб моцных, багатых гаспадарках наогул, а аб моцных эксплёататарскіх гаспадарках сяла, і што гэту групу нельга зьмешваць з працоўнымі гаспадаркамі, хоцьбы і выдатнымі па сваёй заможнасьці з агульнай масы гаспадарак у пэўнай мясцовасьці.

Працу, зьвязаную з абкладаньнем гэтай групы гаспадарак, неабходна ўзяць пад вельмі ўважлівы кантроль. Пры правядзеньні агітацыйнай кампаніі трэба падрабязна спыніцца на прычынах увядзеньня гэтай папраўкі ў закон і зазначыць на тое, якія іменна гаспадаркі будуць выдзелены з агульнага парадку і будуць абкладацца на падставе гэтага парадку.

Другой вельмі значнай навіной новага закону зьяўляецца пераход да вылічэньня падатку не па разьмеру прыбытку на аднаго едака, а па ўсяму прыбытку гаспадаркі.

Пры вылічэньні падатку па разьмеру прыбытку на едака плацілі менш падатку гаспадаркі з вялікай колькасьцю едакоў і больш падатку з малым лікам едакоў. Але, прымаючы пад увагу, што гаспадаркі з вялікім лікам едакоў у пераважнай большасьці зьяўляюцца буйнымі заможнымі гаспадаркамі, усю выгаду ад гэтага парадку вылічэньня падатку мелі гэтыя апошнія катэгорыі гаспадарак.

Пасьля пераходу на вылічэньне падатку з усяго разьмеру прыбытку гаспадаркі цяжкасьць абкладаньня заможных, вялікіх гаспадарак узмоцніцца ў параўнаньні з мінулым годам. Бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам з боку гэтай папраўкі да закону не пагражае павялічэньне падатку. **Бядняцкія гаспадаркі ў разьмеры 35 проц. усіх гаспадарак наогул будуць вызвалены поўнасьцю ад падатку.** Што-ж датыча серадняцкіх гаспадарак з большым лікам едакоў. дык іх інтарэсы, як і ўсіх гаспадарак з вялікім лікам едакоў, забясьпечаны тым, што з агульнага прыбытку гаспадаркі вылічаецца па 20 руб. прыбытку на кожнага едака. Чым больш едакоў, тым больш будзе скідак з агульнага прыбытку гаспадаркі.

Вялікая ўвага надаецца законам вучоту і абкладаньню неземляробчых заработкаў. Трэба проста сказаць, што з гэтым пытаньнем справа стаіць да гэтага часу вельмі дрэнна. Да вучоту гэтых прыбыткаў месцы падыходзілі нясур'ёзна, і таму шмат дзесяткаў кіліёнаў гэтых прыбыткаў зусім ня ўлічвалася. Досыць сказаць, што ў мінулым годзе было ўзята пад вучот усяго 25 міліёнаў гэтых заработкаў, замест 70-80 міліёнаў, прыблізна вылічаных ЦСУ і Дзяржплянам. Апроч таго, абкладалася падаткам нязначная частка ўзятых пад вучот заработкаў—усяго 20-25 проц.

Усе дэфэкты ў гэтай галіне нашае працы зноў прыносілі карысьць найбольш заможным гаспадаркам. Новы закон, напершае, устанаўляе пералік крыніц неземляробчых заработкаў, прыбытак якіх поўнасьцю палягчаецца падаткам. Гэты прыбытак ад здачы ў наём складаных, апрача сеялак, сельска-гаспадарчых машын і прыладаў, ад прамысловых і паўпрамысловых прадпрыёмстваў, а таксама і ад іншых відаў заработкаў непрацоўнага характару. У адносінах іншых крыніц, апрача заработнае платы, процант прыцягненьня ўлічанага прыбытку ў абкладаньне значна павышаецца—у сярэднім на 50 проц.; пры гэтым прыбытак асобных галін неземляробчых заработкаў ад гарбарняў, маслабойняў, млыноў павышаецца, у параўнаньні з леташнім годам, на 100 проц. Інтарэсы бядняцкае і серадняцкае часткі вёскі ў гэтым выпадку даволі абаронены законам.

Раённыя падатковыя камісіі маюць права вызваляць ад абкладаньня неземляробчыя заработкі ў асобных бядняцкіх гаспадарках. Добры вучот гэтых заработкаў, з аднаго боку, і правільнае ўстанаўленьне акруговымі выканаўчымі камітэтамі процантаў прыцягненьня гэтых заработкаў да абкладаньня—з другога боку, прыблізяць прыбытак ад гэтых крыніц у заможных, моцных гаспадарках да сапраўдных межаў, чым будзе палегчана задача па правільным вылічэньні з іх падатку.

У выніку ўжываньня на практыцы памянёных важнейшых папраўак, унесеных у новы закон, мы будзем мець наступныя зьмены ў разьмерах падатку, выплачваемых рознымі групамі гаспадарак: 35 проц. будуць поўнасьцю вызвалены ад падатку, прыкладна 7,6 проц. атрымае зьніжэньне ў параўнаньні з леташнім годам, і каля 33 проц. гаспадарак заплацяць такія-ж сумы падатку, як і ў леташнім годзе і 24,4 проц. гаспадарак (лічба арыентыровачная) атрымлівае павялічэньне падатку. Асобныя гаспадаркі атрымліваюць значнае павышэньне падатку ў параўнаньні з леташнім годам. Цяжка паказаць цяпер процант гэтага павышэньня. Усё залежыць ад якасьці працы па вучоту іх прыбытку. Але толькі адно пэўна, што гэтае павялічэньне падатку закране толькі верхавіну вёскі, якая з прычыны недахопаў закону леташняга году, плаціла куды менш падатку, чымся гэта дыктуецца інтарэсамі народнае гаспадаркі і палітычнымі інтарэсамі самае вёскі.

З.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

аб арганізацыйным аддзеле Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

1. На Арганізацыйны Аддзел Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту складаюцца наступныя абавязкі:

а) пастаноўка і вывучэньне, а таксама высьвятленьне ў друку арганізацыйна-масавай работы саветаў і савецкай грамадзкасьці;

б) падрыхтоўка і правядзеньне ў жыцьцё пастаноў па пытаньнях савецкага будаўніцтва, узмацненьне саветаў, ажыўленьне іх дзейнасьці і залучэньне ў работу саветаў шырокіх працоўных мас гораду і вёскі, а таксама падрыхтоўка і правядзеньне склікаемых па гэтых пытаньнях перыядычных нарад;

в) абсьледваньне, інструктаваньне, а таксама ажыцьцяўленьне пастаяннай арганізацыйнай сувязі з мясцовымі саветамі і выканкомамі шляхам сыстэматычных выездаў работнікаў на месцы;

г) распрацоўка праэктаў палажэньняў, абежнікаў, інструкцый, раз'ясьненьняў мясцовым саветам і выканаўчым камітэтам па пытаньнях аб іх правах і іх арганізацыйнай дзейнасьці;

д) падрыхтоўка пастаноў аб перавыбарах саветаў, аб скліканьні зьездаў саветаў, сэсій, пленумаў, канфэрэнцый і г. д., і зьбіраньне, вывучэньне і апрацоўка матар'ялаў аб ходзе і выніках іх;

е) кіраўніцтва дзейнасьцю саветаў у галіне садзейнічаньня грамадзкім арганізацыям, як-та: сялянскім камітэтам грамадзкай узаемадапамогі, кааперацыі і г. д.;

ж) кіраўніцтва падгатоўкаю кадраў працаўнікоў нізавога савецкага апарату і павялічэньнем кваліфікацыі ўжо працуючых кадраў;

з) вывучэньне і падрыхтоўка пытаньняў аб арганізаваньні новых нацыянальных саветаў;

і) нагляд за своечасным і правільным выпаўненьнем мясцовымі саветамі і выканаўчымі камітэтамі пастаноў Усебеларускіх Зьездаў Саветаў, Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і яго Прэзыдыуму і падача дакладаў у Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб незаконамерных і немэтазгодных пастановах мясцовых саветаў і выканаўчых камітэтаў;

к) вывучэньне пратаколаў, справаздач, дакладаў, сводак і іншых матар'ялаў аб дзейнасьці зьездаў саветаў і выканаўчых камітэтаў і падача ў належным парадку Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту прадстаўленьняў аб неабходнасьці зьмен або папаўненьняў існуючых законаў або палажэньняў, а таксама і іншых прадстаўленьняў, якія вынікаюць з вывучэньня азначаных матар'ялаў;

л) інфармаваньне Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб становішчы і дзейнасьці мясцовых саветаў і выканаўчых камітэтаў і апошніх—аб дзейнасьці Усебеларускіх Зьездаў Саветаў, Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і яго Прэзыдыуму;

м) састаўленьне інфармацыйных вестак і агляду для перыядычнага друку аб дзейнасьці і пастановах Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і яго Прэзыдыуму, а таксама Усебеларускіх Зьездаў Саветаў;

н) азнаямленьне з палучаемымі, у парадку ўзаемнай інфармацыі, матар'яламі саюзных і аўтаномных рэспублік і распрацоўка прапазіцый аб тых мерапрыемствах, якія могуць быць скарыстаны ў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспубліцы;

о) рэдагаваньне і падрыхтоўка к выданьню бюлетэняў, справаздач, рэзалюцый і інш. матар'ялаў Усебеларускіх Зьездаў Саветаў, Сэсій Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і яго Прэзыдыуму;

п) вучот членаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, членаў акруговых выканаўчых камітэтаў, вылучэнцаў, рабоча-сялянскага актыву, а таксама і іншых працаўнікоў савецкага будаўніцтва.

2. Загадчык Арганізацыйнага Аддзелу назначаецца Прэзыдыумам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

3. Загадчык Арганізацыйнага Аддзелу Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ў сваёй дзейнасьці непасрэдна падпарадкаван Сакратару Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

10 мая, 1928 г.
гор. Менск.

ПОЛОЖЕНИЕ

об организационном отделе Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР.

1. На организационный отдел Президиума Центрального Исполнительного Комитета возлагаются следующие обязанности:

а) постановка и изучение, а также освещение в печати организационно-массовой работы советов и советской общественности;

б) подготовка и проведение в жизнь постановлений по вопросам советского строительства, укрепление советов, оживление их деятельности и вовлечение в работу советов широких трудящихся мас города и деревни, а также подготовка и проведение созываемых по этим вопросам периодических совещаний;

в) обследование, инструктирование, а также осуществление постоянной организационной связи с местными советами и исполкомами путем систематических выездов работников на места;

г) разработка проэктов положений, циркуляров, инструкций, раз'яснений местным советам и исполнительным комитетам по вопросам об их правах и организационной деятельности;

д) подготовка постановлений о перевыборах советов, о созыве с'ездов советов, сессий, пленумов, конференций и т. д. и собирание, изучение и разработка материалов о ходе и результатах их;

е) руководство деятельностью советов в области содействия общественным организациям, как-то: крестьянским комитетам общественной взаимопомощи, кооперации и т. д.;

ж) руководство подготовкой кадров работников низового советского аппарата и повышением квалификации уже работающих кадров;

з) изучение и подготовка вопросов об организации новых национальных советов;

и) наблюдение за своевременным и правильным выполнением местными советами и исполнительными комитетами постановлений Всебелорусских С'ездов Советов, Центрального Исполнительного Комитета и его президиума и представление справок в Президиум Центрального Исполнительного Комитета о незаконных и нецелесообразных постановлениях местных советов и исполнительных комитетов;

к) изучение протоколов, отчетов, докладов, сводок и других материалов о деятельности с'ездов советов и исполнительных комитетов и представление в надлежащем порядке Президиуму Центрального Исполнительного Комитета представлений о необходимости изменений или пополнений существующих законов или положений, а также и других представлений, возникающих из изучения отмеченных материалов;

л) информация Президиума Центрального Исполнительного Комитета о состоянии и деятельности местных советов и исполнительных комитетов и последних—о деятельности Всебелорусских С'ездов Советов Центрального Исполнительного Комитета и его президиума;

м) составление информационных сведений и обзоров для периодической печати о деятельности и постановлениях Центрального Исполнительного Комитета и его Президиума, а также Всебелорусских С'ездов Советов;

н) ознакомление с получаемыми, в порядке взаимной информации, материалами Союзных и Автономных Республик и разработка предложений по тем мероприятиям, которые могут быть использованы в Белорусской Советской Социалистической Республике;

о) редактирование и подготовка к изданию бюллетеней, отчетов, резолюций и др. материалов Всебелорусских С'ездов Советов, Сессий Центрального Исполнительного Комитета и его Президиума;

п) учет членов Центрального Исполнительного Комитета, членов окружных исполнительных комитетов, выдвиженцев, рабоче-крестьянского актива, а также и других работников советского строительства.

2. Заведующий организационным отделом назначается Президиумом Цетрального Исполнительного Комитета.

3. Заведующий организационным отделом Президиума Центрального Исполнительного Комитета в своей деятельности непосредственно подчинен Секретарю Центрального Исполнительного Комитета.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

10 мая, 1928 г.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб назначэньні тав. **МЯРКУЛАВА Яўсея Сяргеевіча Намесьнікам Народнага Камісара Працы БССР.**

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР **пастанаўляе:**

Назначыць тав. Мяркулава Яўсея Сяргеевіча Намесьнікам Народнага Камісара Працы БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

10 мая 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о назначении тов. **МЕРКУЛОВА Евсея Сергеевича Заместителем Народного Комиссара Труда БССР.**

Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской Социалистической Советской Республики **постановляет:**

Назначить тов. Меркулова Евсея Сергеевича Заместителем Народного Комиссара Труда БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

10 мая 1928 года.
г. Минск.

СУД.

Рабуншчыкі.

У працягу некалькіх апошніх гадоў в. Барысаўшчына, Глускага раёну, і бліжэйшыя да яе вёскі былі тэрарызаваны шайкай бандытаў і хуліганаў, у якую уваходзілі хлапцы гэтае вёскі Лабан Паўлюк, Бабаковы Мікалай і Логін, Кісьлякевіч Халімон, Ахрэмчык Дзяніс і бліжэйшы дарадчык іх Сіраж Алесь. Апошні хоць непасрэднага ўдзелу ў злачынствах шайкі ня прымаў, але аказваў ёй усялякую дапамогу—хаваў нарабаваныя рэчы і дастаўляў шайцы зброю.

У пачатку 1927 году гэта банда, за выключэньнем Сіража, была судзіма, прычым Кісьлякевіч і Ахрэмчык, як самыя актыўныя ўдзельнікі банды, былі па суду расстраляны, а рэшта засуджаны да зьняволеньня на тэрмін 6-8 гадоў.

У канцы 1927 г. сьледчым органам удалося выкрыць яшчэ шэраг цяжкіх злачынстваў гэтае шайкі, прычым быў выяўлен і ўкрывацель шайкі Сіраж.

13-15 мая г.г. Выязная Сэсія Бабруйскага Акруговага суду ў м. Глуску разглядала гэту справу—і ўстанавіла, між іншым, наступны вельмі жорсткі рабунак, зроблены бандай.

У маі 1927 г. Сіраж параіў бандытам абрабаваць хутар гр-н Сасноўскіх. Сіраж выпрацаваў плян абрабаваньня, даў бандзе зброю, і банда ў складзе Паўлюка Чабана, Бабака Логвіна і расстраляных ужо Кісьлякова і Ахрэмчыка накіравалася на хутар.

Пакінуўшы на панадворку вартаўнікам аднаго з бандытаў, шайка праз разьбітае вакно ўлезла ў хату і пачала арудаваць. Бандыты пачалі зьбіваць абрэзамі маці і дачку Сасноўскіх, патрабуючы грошай. Гр-ка Пархімовіч, якая начавала ў Сасноўскіх, прабавала ўцячы з хаты. Заўважыўшы гэта, Чабан ударам абрэза па галаве забіў яе на сьмерць.

Сасноўскія ў гэты час пасьпелі вырвацца з рук бандытаў і схавацца на гары, але бандыты і там іх знайшлі і пачалі зноў зьбіваць. Адначасова была зьбіта да сьмерці і кватарантка Сасноўскіх Багуслаўская. Забраўшы розныя хатнія рэчы, бандыты уцяклі.

У выніку аказаліся забітымі на сьмерць старая Сасноўская, яе суседка Пархімовіч і кватарантка Багуслаўская.

Выязная Сэсія прыгаварыла: Чабана Паўлюка, Бабака Логвіна і Сіража Алеся да вышэйшай кары—на расстрэл, але на аснове амністыі замяніла ім расстрэл 10 гадамі зьняволеньня з суровым адмежаваньнем. Бабак Мікалай, як ня прымаўшы ўдзелу ў апошнім рабунку, прыгаворан на 6 гадоў зьняволеньня.

Шыфрын.

ХРОНІКА.

ЧАМУ НЕ ХАПАЕ ХЛЕБА?

Вядома, што сёлета хлебазагатоўкі праходзілі слаба. Дзякуючы гэтаму, плян завозу хлеба ў БССР поўнасьцю ня выканан.

Аднак гэта яшчэ ня прычыны вялікіх «хвастоў», якія ў апошні час стаяць каля хлебных крам МЦРК.

У чаргах стаяць і сяляне. Яны з прыгарадных сельсаветаў.

Акруговы інспэктар гандлю т. Гравіт кажа, што ў апошні час прыгараднаму сялянству мука не пасылаецца. Гэта ён тлумачыць абмежаванай колькасьцю запасу мукі. А раз у гарадзкія хлебныя крамы ідуць сяляне, значыць попыт павялічваецца, і хлеба ў Менску не хапае.

Да ўсяго гэтага неабходна дадаць, што адной з прычын «хвастоў» зьяўляецца норма выпечкі хлеба на хлебазаводзе. Справа ў тым, што кіраўніцтва заводу ніяк ня можа ўгадаць, колькі хлеба трэба выпякаць у суткі. І колькі кіраўнікі заводу ні стараюцца, попыт ашуквае іх. Выходзіць, што хлебазавод,—як той баечны фурман: 7 год па адной дарозе езьдзіць і... „кажинный раз на эфтом самом месте“.

Калі хлебазавод выпусьціць 1600 пудоў хлеба ў суткі, дык яго ў крамах не хапае. Пройдзе дзень, другі, хлеб выпадкова астанецца і зачарсьцьвее. **Тады хлебазаводаўцы рашаюць, што «норма спажываньня скарацілася і трэба скараціць норму выпечкі».** *Возьмуць, ды скарацяць.*

Вось, такім чынам, і выпечку на панядзелак (21 мая) скарацілі. Выпеклі 1300 пудоў. Хлеба не хапіла. Вырасьлі чаргі.

Трэба, каб НК РСІ заняўся хлебнаю справаю, бо бяз гэтага ўсё і заўсёды будуць складаць на людзей:

— Напряженное состояние потребителя.

Чуць што, дык спажывец (які знаходзіцца ў „напряженном состоянии“) ідзе ў чаргу, каб зьменшыць сваё «напряженное состояние».

Нам здаецца, што ўжо даволі гутарак. Пара ўзяцца за справу. Спажывец павінен мець хлеб. Ён не павінен знаць ніякіх «напряженных состояний», яму дай хлеба, і чаргі ня будзе. А раз чаргі ёсьць, значыць не спажывец вінават. Вінаваты тыя, хто не дае хлеба, а ў першую чаргу МЦРК.

С. А.

Плян працы Беларускіх Дзяржаўных тэатраў на 1928-29 г.

Наркамасьветы зацьвердзіў плян працы Беларускіх Дзяржаўных тэатраў на 28-29 г. Згодна пляну, 1-ы Беларускі Дзяржаўны тэатр будзе працаваць увесь тэатральны сэзон у г. Менску. БТД 2 з 1 кастрычніка 1928 г. да 1 лютага 1929 г. будзе працаваць у Магілеве, а потым да канца сэзону ў Віцебску. Бел. Дзярж. Яўрэйскі тэатр адчыніць тэатральны сэзон у Віцебску і прабудзе там да 1-га лютага, а потым пераедзе ў Магілеў, дзе будзе працаваць да канца сэзону.

Па сканчэньні тэатральнага сэзону 1927-28 г. 1-ы БДТ пераедзе ў Менск, 2-гі—у Магілеў і яўрэйскі—у г. Віцебск.

Непарадкі зоолёгічнае выстаўкі.

Вось каля двух тыдняў, як у Менск прыехала «перасоўная зоолёгічная выстаўка».

З якою мэтаю гэта выстаўка сюды прыехала? Чаму ніхто ня хоча зацікавіцца ўсім тым, што робіцца на гэтай выстаўцы? А робіцца там досыць прыкрая справа. Вось некалькі дыялёгаў, якія амаль кожны дзень адбываюцца на гэтай выстаўцы.

— Запішэце, калі ласка, на чаргу 2-ю клясу № школы.

— Добра, але толькі, каб было 30 чалавек у групе, бо ў адмоўным выпадку будзеце плаціць па 40 кап.

— Прабачайце,—кажа зьдзіўлены настаўнік,—у вас-жа абвестка...

— Ну, дык і ідзеце па абвестцы, а мне не перашкаджайце.

— У нас-жа малыя дзеці. Трэба па 15 капеек.

— Нам трэба карміць жывёлу, мы ня можам інакш.

— Добра,—згаджаецца настаўнік,—будзем плаціць па 20 кап., але на 30 чалавек у вас ёсьць 3 вучні, якія зусім ня могуць плаціць.

— Нічога ня знаю. Плаціце грошы і ідзіце, і ніводнага вучня лішняга.

Ніякія просьбы не дапамогуць.

Другі прыклад. 20 мая па папярэдняму ўгавору з'арганізавана была рабочая экскурсія. Арганізаваным парадкам прыйшло 18 асоб. Адміністратары катэгарычна адмовіліся прапусьціць.

— Вы—ня экскурсія, у вас толькі 18 асоб. Экскурсія павінна мець ня менш 25 асоб.

Сядзіць гэткая «асоба» з манікюрам на руках, есьць шакаляд і з пахабнай усьмешкай кажа:

— Каб вас было нават 24 асобы, я і ў такім выпадку ня пусьціў-бы па 20 кап. Плаціце па 40 кап. і глядзеце.

Калі адзін з рабочых зазначыў на недапусьцімасьць падобных адносін, дык адміністратар яшчэ з большай пахабнасьцю зазначыў:

— Вы мне ня ўказ. Я тут нікому не падпарадкаваны, і што хачу, тое і раблю.

Такое зьявішча трэба як мага хутчэй зьнішчыць. Трэба паказаць зазнаўшымся адміністратарам, што яны не ў капіталістычнай дзяржаве. Падобны бюракратычны падыход да рабочых ды і наогул у савецкай краіне зусім не патрэбен.

Хаця выстаўка бяссыстэмна і наогул малакаштоўна, але яна наведваецца вялікім лікам дзяцей. Прыкра неяк, што Інспэктарыят Асьветы нічога ў гэтым сэнсе не зрабіў.

R.

Стан азіміны.

Паводле вестак Цэнтральнай Статыстычнай Управы БССР, стан азіміны на 15-га мая па паасобных акругах мае такі выгляд: Полацкая акруга—2,4 бала; Віцебская—2,3; Аршанская—2,7; Менская—2,5; Магілеўская—2,9; Бабруйская—2,7; Мазырская—2,1 і Гомельская—2,8. Агульная ацэнка азіміны па БССР—2,6 бала.

У параўнаньні са станам азіміны на 1-га мая, агульная ацэнка па БССР застаецца той-жа самай.

Па паасобных акругах стан азіміны зьмяніўся так: па Аршанскай і Магілеўскай акругах павысіўся на 0,1 бала, астатнія акругі даюць паніжэньне ад 0,1 да 0,3 бала.

Што датычыцца становішча сенажацяў, дык агульная ацэнка сухадольных сенажацяў па БССР—2,1 бала, канюшыны—2,4 бала.

У параўнаньні з мінулым годам, стан сухадольных сенажацяў павысіўся на 0,4 бала, а стан канюшыны панізіўся на 0,4 бала.

50 ПАЛЯВЫХ ЯСЬЛЯЎ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ БАТРАЧАК І СЯЛЯНАК.

Менскі акруговы аддзел аховы здароўя арганізуе па Менскай акрузе 50 палявыя яслі. У гэтыя яслі будуць прымацца дзеці батрачак і сялянак, якія заняты на палявой працы.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 23 МАЯ 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—69, куп. 4—67.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—03,5, куп. 5—01,5.
Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—06, куп. 5—04.
Абл. 10 пр. дзярж паз. 27 г.—прад. 25—36. куп. 25—26.
Абл. дзярж. паз.-1926 г.—прад. 121—25, куп. 119—25.
Абл. 12 проц. дзярж. паз.—прад. 105—77, куп. 105—72.
Абл. 6-проц. паз. індустр.—прад. 24—46,5 куп. 24—35,5.

АПАВЯШЧЭНЬНІ.

ГАБІНЭТ ПАЛІТАСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 23 мая роўна а 12 гадз. дню адбудзецца шырокая нарада па пытаньні аб **АРГАНІЗАЦЫІ МАСАВЫХ ЭКСКУРСІЙ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ У ПРЫГАРОДНЫЯ САЎГАСЫ І КАЛЕКТЫВЫ.** Запрашаюцца прадстаўнікі акругкому партыі, камсамолу, культаддзелу ЦСПСБ, ЦП саюзаў, аграсэкцыі, клюбаў і ад Дасьледчага Інстытуту прафэсар Скандракоў і іншыя.

КУТОК ВУЧОНЫХ.

У пятніцу, 25 мая, адчыняецца пленум цэнтр. савету сэкцыі навуковых працаўнікоў. Адначасова адбудзецца агульны сход сяброў сэкцыі г. Менску. На парадку дня: пытаньні каштарысныя, курортнай дапамогі і інш. Пач. роўна а 11 гадз. раніцы. Ц. Б.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У чацьвер, 24 мая, спэктакль «Даходное место» Астроўскага. Пачатак а 9 гадз. Кошт білета ад 15 да 40 кап.

ЦЫРК-КІНО.

Толькі тры дні будзе дэманстравацца баявік „ТРЫПОЛЬСКАЯ ТРАГЭДЫЯ“

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».

З 22 мая—прыключэнская пастаноўка „НАЧНЫ ЭКСПРЭС“. У гал. ролі Гары Піль. Штодня 3 сэансы. Пачатак 1-га сэансу ў 7 гадзін.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“.

З 22 мая—працяг 2-й і заключная 3-я сэрыя „ПЛЯМА ЗЛАЧЫНСТВА“ у 12-ці частках

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».

Новы бытавы фільм „ГАНЧАРЫ“ («Шчасьлівыя чарапкі») у 6-х частках. Пачатак сэансаў у 7 гадз. 45 хв.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».

У аўторак, 29 мая, у 12 гадз. дня ў памяшканьні Менскага Дзяржаўнага Тэатру адбудуцца ТАРГІ НА ЗДАЧУ ЗНАДВОРНАГА РАМОНТУ БУДЫНКУ ТЭАТРУ. Аб умовах можна даведацца ў канцылярыі тэатру ад 10-й гадз. раніцы да 2-й гадз. дня.

Менскі ЗАГС паведамляе, што гр-не **КАЦЁЛ Аляксандр Аляксандраў** (нар. 1887 г.), яго жонка **КАЦЁЛ Міхаліна Ксавэр'ева** і іх дзеці **Адам** (нар. 1911 г.) і **Ядзьвіга** (нар. 1912 г.), якія паходзяць з вёскі Калодзезнае, Капыльскага р., Менскай акр., і праж. там, зьмяняюць прозьвішча **Кацёл** на прозьвішча **«Міжыеўскія».**

Асоб, якія маюць перашкоды да зьмены прозьвішча, просяць паведаміць у Менскі ЗАГС.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Лекавае пасьведчаньне Гаўрылава А., выд. Барысаўскай страхкасай.
— Сяброўскі білет, выд. саюзам драваапрацоўнікоў, 2) дапрызыўная кніжка, выд. гарсаветам, 3) беспрацоўная кніжка, выд. страхкасай на імя Дзягіля Ф. З.
— Квіт аб уплаце заклада № 492 Ровіна Т., выд. Барысаўскай камгаспад.
- Паявая кніжка № 566 Шклоўчыка Ф. Я., выд. Барысаўскім МЦРК.
— Конская карт. Локіса Б. С., выд. Глівенскім сельсаветам.
— Конская кніжка Сермяжко А. Р., выд. Барысаўскім РВК.
— Вайсковая карт. № 10 Ікона І. І.
— Паявая кніжка № 5132 Садоўскага І. А., выд. Барысаўскім ЦРК.
— Дапрызыўная кніжка Шуронскага Б. Т., выд. Барысаўскім РВК.
— Конская карт. Сацукевіча І. К., выд. Барысаўскім РВК.
— Конская карт. Карпацкага Р. П., выд. Мільчанскім сельсаветам.
— Партбілет № 0811509, выд. Барысаўск. Акружк. КПБ і камсамольскі білет № 39230, выд. Барысаўск. Акружк. КСМ на імя Карэнкава В. Ф.
— Конская карт. № 586 Швайбовіча Е. І., выд. Барысаўск. РВК.
— Мэтрычн. выпіс Гайнтмана Л. Б, выд. Барысаўск. Загсам.
— Асабовае пасьведчаньне, спраўка аб працы Тарасевіча С.
— Конская карт. № 2379 Дзебеня А. Ф.
— Сяброўская кніжка № 1470 Рамаоўскага А. І., выд. саюзам мэталістаў.
— Конская карт. Грыбкова І. І., выд. Смалявіцкім РВК.
— Паявая кніжка № 4350 Гарлевіча А. А., выд., Барысаўскім ЦРК.
— Паявая кніжка Зуева В. П., выд. Барысаўск. ЦРК.
— Лекавая кніжка Беляева І. В., выд. Барысаўск. страхкасай.
—Сямейны білет Крукава Ў. А., выд. Нелавіцкім с-саветам.
— Чырвонаарм. кн. Жылкевіча Т. Н., выд. 2-м Артпалком.

Новы кадр спэцыялістаў па мэліарацыі.

Гэтымі днямі адбыўся выпуск Менскага Дзяржаўнага Гідратэхнікуму. Выпушчана 37 новых гідратэхнікаў, якія ўжо накіраваны ў акругі БССР на мэліарацыйныя работы.

Апроч таго, на мэліарацыйныя работы накіравана 69 студэнтаў старшых курсаў мэліарацыйнага факультэту Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі.

Узмацненьне берагоў ракі Сьвіслачы.

У Інспэкцыю Рэспубліканскага Інжынэра паступіў праэкт работ па ўзмацненьні берагоў ракі Сьвіслачы на вучастку паміж Савецкай і Першамайскай вуліцамі.

Гэтыя работы маюць распачацца ў бліжэйшым часе.

Правядзеньне ўсіх работ будзе каштаваць 40000 руб.

ЧАСОВАЕ СПЫНЕНЬНЕ ПРАЦЫ НА ФАБРЫЦЫ «ДНЯПРО».

Рэчыца, 18-У. Сярніковая фабрыка «Дняпро» спыняе сваю працу з 15 чэрвеня па 1-га ліпеня для рамонту.

Новыя кнігі.

Вышлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кніжкі Выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1. **„Жилкооперация и участие в ней женщин“** Н. Левін, стар. 49, цана 20 кап. (на расейскай мове).
2. **„Як захаваць зялёны корм на зіму“** М. Уцехін, стар. 48, цана 25 кап. (Кніжка прэміявана Агранамічным Журы Хэрсонскай губ. Управы ў 1915 годзе).
3. **«Апавяданьне прыгоннай бабулі».** Па т. Фарафонавай, стар. 27, цана 20 кап.
4. **«Юныя гэроі»** (Апавяданьні для дзяцей]. З расійскае мовы пераклала А. Савёнак. Стар. 24, цана 25 кап.
5. **«Вянок Вясёлкі».** І. Эйдукс, стар. 84, цана 60 кап. (на літоўскай мове).
6. **«Большевик» № 8 за 1928 г.,** стар. 100, цана 40 кап. Выданане газэты „Правда“ Масква.

Менскі дзень.

Аб водпуску 3.000 руб. просіць ЦП Саюзу Працаўнікоў Асьветы ў ЦК Саюзу на выданьне старонкі асьветніка і спэцыяльнага дадатку да газэты „Савецкая Беларусь“—„Працаўнік Асьветы“.

Беларускі Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр выехаў з дазволу Наркамасьветы на гастролі ў Украіну. Гастролі працягнуцца да 8 ліпеня.

Праф. Гросман-Рошчын прачытае шэраг лекцый у клюбе Карла Маркса на тэмы: «Што адбываецца на фронце мастацтва», „Творчасьць і сьветапагляд Л. М. Талстога“. Збор паступіць у карысьць Цэнтральнай касы ўзаемадапамогі студэнтаў БДУ.

44 трактарыстаў выпусьцілі 3-месячныя курсы трактарыстаў у Менску. Выпушчаныя трактарысты будуць разьмеркаваны па акругах.

3000 руб. адпусьціў Наркамздраў на арганізацыю 2-хтыднёвых курсаў для падрыхтоўкі працаўнікоў для прышчэпкі воспы ў сельскіх мясцовасьцях БССР.

Паштовая скрынка.

К. Артыкул «Неабходна вырашыць» да друку не падышоў. Вы закранулі вельмі важнае пытаньне, але ня зусім яскрава яго высьветлілі. Пабрабуйце распрацаваць гэту тэму шырэй і грунтоўней.

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ.

У працоўныя гушчы!

Праз месяц адбудуцца чарговыя выпускі студэнтаў мэдыцынскага і пэдагагічнага факультэту БДУ. Новыя кадры кваліфікаваных працаўнікоў—дактароў і настаўнікаў—выйдуць з мудраў вышэйшай школы на практычны шлях жыцьця.

Перад новымі спэцыялістамі наша краіна ставіць вялікія і цяжкія задачы, але выконваць іх—ганаровы абавязак.

У нядзелю, 20 мая, адбыўся агульны сход усіх студэнтаў выпускнікоў, на якім **тав. Кнорын** зрабіў даклад аб задачах, што зараз стаяць перад кожным савецкім спэцыялістым і асабліва перад канчаючым выш. навуч. установу зараз.

Тав. Кнорын зьвярнуў увагу выпускнікоў на наступныя задачы:

Знайсьці найбольш адпаведныя шляхі выкарыстоўваньня канчаючых вышэйшую школу і апошнім трэба катэгарычна адмовіцца ад думкі, што лепш працаваць у горадзе ў канцылярыях у якасьці рэгістратараў, перапісчыкаў і г. д., чым накіравацца для працы ў вёску. Абавязак канчаючых ВНУ—накіравацца для творчай працы туды, дзе трэба правесьці гаспадарчую і культурную рэвалюцыю, дзе патрэбны працаўнікі, каб змагацца з цемрай, сахой і трохпалёўкай; яны не павінны баяцца пайсьці ў самыя глухія куткі БССР у вёску, якая іх чакае, бо яны там неабходны, каб падняць шырокія колы на шлях культурнай рэвалюцыі.

Пралетарскі спэцыяліст павінен быць актыўным грамадзкім дзеячом; выходзячы зараз з мураў БДУ павінны ў сваёй працы падтрымліваць належны кантакт з найшырачэйшымі масамі, сарод якіх ім прыдзецца працаваць,—толькі ў гэтым выпадку і пры гэтых умовах яны змогуць быць карыснымі працаўнікамі савецкае рэспублікі. Хто ня будзе гэтага рабіць, ня будзе прымаць актыўнага ўдзелу ў грамадзкім жыцьці, той з часам будзе вымецен з сям'і пралетарскіх спэцыялістаў рэвалюцыйнай савецкай грамадзкасьці.

Неабходна кожнаму спэцыялісту зрабіць савецкае «хождение в народ», у гушчы працоўных і сялянскіх мас, каб ведаць іх імкненьні і запатрабаваньні і накіроўваць гэтыя імкненьні на правільны сацыялістычны шлях. Узмацніць беларусізацыю, бо ў нашых умовах гэта—справа сувязі працоўных гораду з сялянствам, гэта справа посьпеху нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Заканчваючы даклад, тав. Кнорын падкрэсьліў, што неабходна засучыўшы рукавы, з энэргіяй, бадзёрасьцю і энтузыязмам накіравацца на творчую працу, вынікі якой будуць адчувацца ў агульных посьпехах сацыялістычнага будаўніцтва нашае краіны.

Студэнты-выпускнікі ў прынятай па дакладу рэзалюцыі заявілі аб сваёй гатоўнасьці атрыманыя ў працягу 4—5 гадоў навучаньня веды перанесьці ў масы рабочых і сялян.

Яшчэ 4 тыдні—і некалькі сот новых культурных будаўнікоў уваллюцца ў шэрагі мэдыцынскай і асьветніцкай гвардыі.

Зараз слова за Нар. Кам. Асьветы і Нар. Кам. Аховы Здароў'я. Яны павінны заўчасна падумаць, каб усіх канчаючых вышэйшую школу разьмеркаваць на працу, павёўшы рашучую барацьбу з бюракратызмам і няўважлівасьцю некаторых нашых устаноў да новых спэцыялістаў.

Львовіч.

Нашае сёньня.

(Менскі Белпэдтэхнікум).

У працягу красавіка і мая г. г. рабілася дасьледваньне быту і настрояў студэнцтва нашага тэхнікуму. На падставе сабранага матар'ялу мы і падаём некаторыя вывады.

Усяго зараз у тэхнікуме навучаецца 236 чалавек. Па сацыяльнаму складу студэнты падзяляюцца такім чынам: сялян—128, рабочых—20, выхаванцаў дзіцячых дамоў—16, служачых—72. У інтэрнатах жыве 167 чалавек.

Стыпэндыяй забясьпечана 160 чалавек, з якіх 17 чал. атрымлівае па 18 руб., 91 чал.—па 15 р., 45 ч.—па 7 р. 50 к., 5 ч. па 25 руб. 1 па 20 р. і 1 па 9 р. Пабочны заработак мае зусім няззначны процант студэнцтва, а калі ён і маецца, то, галоўным чынам, ад працы на лікпунктах. 21 проц. студэнцтва атрымлівае дапамогу з дому, у разьмеры ад 3 да 15 руб. у месяц.

Большасьць студэнцтва харчуецца ў сваёй сталоўцы, дзе абед каштуе 7 р. 50 кап. і сьнеданьне 3 р. у месяц. Чуць не палова агульнага ліку не вячэрае; 5 проц. ядуць 1 раз у дзень.

Для таго, каб здабыць вопратку, студэнту трэба эканоміць на харчаваньні. Так, напр., значная частка дзяўчат ядуць адзін абед у дзьвёх. На культ. патрэбы траціцца у м-ц ад 50 к. да 1 рубля.

Эканамічнае становішча студэнцтва вельмі цяжкае. Колькасьць і памер стыпэндый недастатковы, з прычыны чаго часткі бядняцкай моладзі з-за матар'яльных умоў прыходзіцца кідаць вучобу; так, у гэтым годзе Тэхнікум пакінула 9 асоб, замест якіх былі прыняты служачыя. Дрэннае матар'яльнае становішча адбіваецца на здароўі студэнцтва, а разам з гэтым і на вучобе. У мінулым годзе 46 проц. студэнцтва аказаліся хворымі.

Вывады ясныя: павялічэньне колькасьці і памеру стыпэндыяй—задача сёньняшняга дня.

У далейшым трэба павесьці барацьбу з гэтым зьявішчам праз арганізацыю гурткоў НАП (навук. арган. працы) і пераход на дартаурную сыстэму (г. зн., усе заняткі перанесьці з інтэрнату ў тэхнікум).

Адносна этыкі зазначым наступнае.

Бываюць выпадкі, калі студэнты „выпіваюць“. Лаянка—масавае зьявішча. Распаўсюджана даваньне мянюшак, як «аўстрыец», «лабук», „шляпа“ і г. д. Маюцца «жарцікі», якія прыводзяць да сутычак, як, напр., рэгулярнае падліваньне вады ў пасьцель, вымазваньне чарнілам твару і інш.

Наглядаюцца і чыста хуліганскія выпадкі, як псаваньне насьценгазэты, шляхам вымазваньня прозьвішчаў, выпраўленьня і вырэзваньня заметак і інш.

Вядзеньню культ.-масавай працы перашкаджае адсутнасьць сродкаў і належнага памяшканьня.

26,6 проц. студэнцтва незадаволена настаўніцкай прафэсіяй, матывуючы гэта тым, што настаўніку плацяць „як пастуху“. Аднак, большасьць прафэсіяй настаўніка цікавіцца і часта яе ідэалізуе.

Рэлігійных сярод студэнтаў няма. Большасьць сябе лічаць атэістамі і знаходзяць патрэбнай барацьбу з рэлігіяй.

С. Ліхадзіеўскі і М. Ковель.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

ПАСТАНОВА № 43

Народнага Камісарыяту Гандлю БССР

"АБ ЗЬМЯНЕНЬНІ ПАСТАНОВЫ НК ГАНДЛЮ БССР АД 10-1—28 г. АБ ЗАБАРОНЕ МЛЫННЫМ ПРАДПРЫЁМСТВАМ ПЕРАПРАЦОЎКІ ЖЫТА І ПШАНІЦЫ Ў ГАТУНКОВЫЯ ПАМОЛЫ".

21 мая 1928 г. г. Менск.

У зьмену п. 1 і 2 пастановы НК Гандлю БССР за 10-I—28 г. № 2 „аб забароне млынным прадпрыёмствам перапрацоўкі жыта і пшаніцы ў гатункавы памол выхадам ніжэй 95 проц.“ (апублікаван. у газ. «Сав. Беларусь» за 12-I—1928 г. № 10, Камэрц. Бюл. «Белкта» за 14-I—28 г. № 4 і бюл. СНК БССР за 20-I—28 г. № 1),—**Народны Камісарыят Гандлю БССР,** на падставе загаду Народнага Кам. Замежнага і Унутр. Гандлю СССР ад 18 і 19 мая 1928 г. за №№ 6-3115 і 6-3124 і ад 20-У—28 г. за № 6-3141—**пастанаўляе:**

1. Забараніць усім млынапрадпрыёмствам як дзяржаўным і кааперацыйным, так і прыватным перапрацоўку зярна ў гатунковыя памолы выхадам жытняй мукі ніжэй 95 проц. і пшанічнай ніжэй 80 проц., незалежна для якіх памольцаў апошнія выпрацоўваюцца—для ўласнай патрэбы па даручэньні альбо для продажу.

2. Для паказаных у п. 1 памолаў устанавіць наступныя адзнакі, якія павінны характаразаваць іх якасьць:

Гатунак памолу	% выхаду мукі	% зольнасьці	% вільготнасьці
Жытні абойны	95	1,9	15,5
Пшанічны аднагатунковы . .	80	1,0	15,5

Увага: Жытняя мука абойная абавязкова павінна прапускацца праз абойку 2 разы.

3. Забараніць усім хлебавыпякаючым прадпрыёмствам як дзяржаўным і кааперацыйным, так і прыватным рабіць высеўку паказанай у п. п. 1 і 2 мукі, а таксама мукі простых памолаў у муку вышэйшых гатункаў і выпуск выпякаемай з гэтай мукі прадукцыі.

4. Гэтая пастанова ўваходзіць у дзейнасьць з моманту яе апублікаваньня.

5. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на акруговых інспэктароў гандлю, на дзяржаўную Хлебную Інспэкцыю, Сельсаветы і Міліцыю.

6. Вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы падлягаюць адказнасьці: службовыя асобы паводле арт. арт. 106 і 141 Кр. Кодэксу, а прыватныя—паводле арт. 141 таго-ж Кодэксу.

Наркамгандлю БССР АДАМАЙЦІС.

Сакратар ВЕРАМЕЙЧЫК.

Галоўлітбел 302.

1-я Дзяржаўная друкарня.